ШКОЛА МУЖНАСЦІ ДЛЯ НАВАБРАНЦАЎ 11





КАРЫСНЫЯ СПРАВЫ — ТАЛАКОЙ МС

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

30 КАСТРЫЧНІКА 2024 г.
СЕРАДА
№ 212 (30346)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

## КОРАТКА

- Беларусь перасягнула ўзровень пікавага 2019 года па экспарце ў краіны Афрыкі.
- **У Беларусі з 1 лістапада 2024 года павялічваюцца памеры бюджэту пражытачнага мінімуму.**
- З 1 лістапада павялічацца «ўзроставыя» даплаты да пенсій.
- **У краіне больш за 2 тыс. бальнічных палат аснасцілі па праекце «Наша ўвага ветэранам вайн і працы».**
- Перспектывы паставак тэхнікі BELARUS на газаматорным паліве ў Сахалінскую вобласць абмеркавалі на Мінскім трактарным заводзе ў час наведвання прадпрыемства губернатарам расійскага рэгіёна Валерыем Лімарэнкам.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр РУМАК, упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў:**

*«Узаемадзеянне дзяржавы і рэлігіі важнае на сучасным гістарычным этапе. Наша краіна жыве ва ўмовах знешніх рызык і пагроз, свет сёння вельмі неспакойны. Беларусь захоўвае стабільнасць і спакой. Прымаюцца меры, каб і надалей захоўвався міжканфесійны мір і згода на нашай зямлі. Рэлігійныя арганізацыі з'яўляюцца важным партнёрам у гэтай рабоце. Для таго, каб людзі розных веравызнанняў жылі ў міры і згодзе, патрэбна ўзаемадзеянне дзяржаўных органаў і рэлігійных арганізацый. Дзяржава вядзе дыялог з усімі, каб яны маглі адчуваць, што не абдзелены ўвагай, каб чуць кожнага і ў дыялогу вырашаць усе праблемы, якія могуць узнікаць».*

З першых вуснаў

# «Ідучы да людзей на экзамен, мы павінны сказаць, што мы зробім»

## Прэзідэнт заслухаў даклад аб рабоце аграпрамысловага комплексу



Фота БелТА.

**Размова ішла аб сітуацыі на зямлі ў цэлым, і найперш — у сельскагаспадарчых арганізацыях краіны. Кіраўніка дзяржавы цікавіла, з якімі вынікамі аграрыі завяршаюць сельскагаспадарчы год. Акрамя таго, закранулася дарожная тэма, пытанне якасці айчыннай прадукцыі. Гаварыў Аляксандр Лукашэнка і аб будучых прэзідэнцкіх выбарах: у адрас патэнцыйных кандыдатаў у Прэзідэнты прагучала канкрэтная парада. Сярод удзельнікаў нарады — намеснік прэм'ер-міністра Юрый Шулейка, міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Анатоль Ліневіч, старшыня Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Аляксандр Турчын і старшыня Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Уладзімір Кухараў. Калі профільныя віцэ-прэм'ер і міністр былі запрошаны ў Палац Незалежнасці для дакладу аб сітуацыі ў аграпрамысловым комплексе, то губернатар Мінскай вобласці, як заўважыў сам Прэзідэнт, — для аб'ектыўнасці гэтага дакладу. «Уладзіміра Яўгенавіча (Кухарава. — «Зв.») запрасіў для таго, каб мы маглі публічна сказаць: чым мы сельскай гаспадарцы дапаможам у будучым годзе», — патлумачыў Аляксандр Лукашэнка.**

### «Людзям трэба дастаць і пакласці»

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што, будучы губернатарам Брэстчыны, цяперашні віцэ-прэм'ер, які курыруе сферу АПК, Юрый Шулейка абураўся, што з боку сталіцы Мінскай вобласці аказвалася дапамога ў будаўніцтве малочнатаварных комплексаў. «І цалкам справядліва тады, як губернатар паставіў пытанне: маўляў, чаму б і мне хаця б адзін жывёлагадоўчы комплекс Уладзімір Яўгенавіч не дапамог пабудаваць, бо малако Мінску Брэст пастаўляе, як і ўсе вобласці», — канкрэтызаваў Аляксандр Лукашэнка.



У сувязі з гэтым ён даручыў Уладзіміру Кухараву дапамагчы пабудаваць хоць бы па адным малочнатаварным комплексе ў кожнай вобласці. «Нават калі ты ў Мінску не знойдзеш поўнасцю грошай на гэта, дык я ўжо падстаўлю плячо», — паабяцаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што сітуацыя сёння ў краіне такая, што проста расказваць і гаварыць ужо недастаткова — народ не прыме. «Людзям трэба дастаць і пакласці, — лічыць Аляксандр Лукашэнка. — Гэта правільна. Таму, ідучы ў прэзідэнцкую кампанію, я ж вас прадстаўляю — уладу. Таму мы павінны народу сказаць: калі дарогі — дзе і як. Я ўжо агучыў: ад раённых цэнтраў да аграгарадкоў».

СТАР. 2

На слыху

# ЗНІЗІЦЬ АВАРЫЙНАСЦЬ І ТРАЎМАТЫЗМ

## Што змяняецца для аматараў сродкаў персанальнай мабільнасці?

**У гарадах пастаянна расце колькасць сродкаў персанальнай мабільнасці (СПМ), а разам з тым павялічваецца колькасць ДТЗ з іх удзелам. Якія змяненні прапануюцца ў правілы дарожнага руху і каго яны будуць датычыцца? Ці закрануць гэтыя змены веласіпедыстаў? Якія меркаванні на гэты конт выказваюць грамадзяне? Пра гэта і іншае расказалі эксперты.**

СТАР. 5



26 студзеня 2025
ВЫБАРЫ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

# Цэнтрвыбаркам прыняў рашэнне аб рэгістрацыі ініцыятыўнай групы па вылучэнні Аляксандра Лукашэнкі кандыдатам у Прэзідэнты

«Прадстаўленыя дакументы адпавядаюць патрабаванням артыкула 61 Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь, — патлумачыла на пасяджэнні Цэнтральнай выбарчай камісіі **начальнік прававога аддзела ЦВК Алена ГРЫГАРОВІЧ.** — Кандыдатура Лукашэнкі Аляксандра Рыгоравіча адпавядае патрабаванням, якія прад'яўляюцца Канстытуцыяй і Выбарчым кодэксам Рэспублікі Беларусь да кандыдата на гэтую пасаду».

На пасяджэнні Цэнтрвыбаркама таксама было прынята рашэнне аб адмове ў рэгістрацыі ініцыятыўнай групы грамадзян па вылучэнні кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь Драздова А. А. у сувязі з непрадстаўленнем спіса членаў ініцыятыўнай групы, Губарэвіча Ю. І. — у сувязі з накіраваннем дакументаў па электроннай пошце, што не прадугледжана выбарчым заканадаўствам. Пры гэтым ні адзін, ні другі на пасяджэнне ЦВК Беларусі не з'явіўся.

Цэнтральная выбарчая камісія нагадвае, што прыём дакументаў для рэгістрацыі ініцыятыўных груп грамадзян па зборы подпісаў выбаршчыкаў у падтрымку вылучэння кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь ажыццяўляецца да 1 лістапада 2024 года.

Часткамі другой і трэцяй артыкула 61 Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь устаноўлена, што дакументы для рэгістрацыі ініцыятыўнай групы выбаршчыкаў па вылучэнні кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь падаюцца ў ЦВК асобай, якая мае намер вылучыцца кандыдатам у Прэзідэнты, або яе прадстаўніком, які ажыццяўляе свае паўнамоцтвы на падставе аформленай ва ўстаноўленым парадку даверанасці. Права прадстаўлення такіх дакументаў па электроннай пошце заканадаўствам не прадугледжана.

**Паводле прэс-службы ЦВК.**

ISSN 1990 — 763X
24212

# «Ідучы да людзей на экзамен, мы павінны сказаць, што мы зробім»


Фота БелТА.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Пры гэтым кіраўнік дзяржавы адзначыў, што многае ўжо зроблена, засталіся зусім невялікія работы. «Але, і міма праходзячы, да аграгарадкоў мы павінны задзейнічаць і буйныя вёскі, якія былі калісьці цэнтрамі гаспадарак, не забываць пра іх, — канкрэтызаваў пастаўленую раней задачу Прэзідэнт. — Так, у аграгарадках у асноўным будуць жыць людзі, але і ў гэтых буйных вёсках, ды і ў дробных — там жа вялікая колькасць нашых людзей. Асабліва старых, якіх мы нікому кінуць ні на чые плечы не зможам. Нам трэба пра іх паклапаціцца».

### «За наступную пяцігодку мы вырашым пытанне малочнатаварных комплексаў»

Кажучы аб якасці прадуктаў харчавання, Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што яна пачынаецца з фермы, малочнатаварнага комплексу. І тут многае зроблена. «Мы ведаем, як, што рабіць, тэхналогіі, і гэтых комплексаў нямала пабудавалі, — канстатаваў беларускі лідар. — Мы павінны людзям прама сказаць, што за наступную пяцігодку вырашым пытанне малочнатаварных комплексаў. Дойны статак, каровы павінны стаяць у гэтым палацы. Для таго, каб атрымаць чыстае малако. У рэшце рэшт карова гэтага заслужыла».

Прыводзячы ў прыклад Мінскую вобласць, Прэзідэнт заўважыў, што засталося некалькі гадоў для таго, каб вырашыць гэту праблему. Па яго словах, трэба падцягнуць Віцебскую, Магілёўскую, часткова Гомельскую вобласці. «Я не думаю, што там таксама ўжо такія вялікія праблемы, каб пабудаваць гэтыя комплексы, — перакананы Аляксандр Лукашэнка. — Самае галоўнае — мы ведаем, якія яны павінны быць і што там трэба. Пры тым гэта імпартазамяшчальны прадукт. Тут імпартнага нам нічога не трэба. Мы ўсё можам пабудаваць самі».

Прыводзячы прыклады па ўзвядзенні і рэканструкцыі дарог, будаўніцтве малочнатаварных комплексаў, Прэзідэнт звярнуў увагу: «Ідучы да людзей сёння на экзамен (яны ў нас прымуць экзамен за пяцігодку), мы павінны сказаць, што мы зробім. Канкрэтна. Вось і ўся палітыка. А прыгожа гаварыць, балбатаць мы ўсе ўмеем».

Пры гэтым кіраўнік дзяржавы адзначыў, што і гэта трэба ўмець, асабліва палітыку, будучаму Прэзідэнту. «Але галоўнае — гэта канкрэтыка: што ты зробіш і што ў цябе за плячыма, — падкрэсліў ён. — Сітуацыя памянялася. Калі хтосьці са старым багажом сюды на выбары імкнецца выйсці, трэба быць вельмі акуратным. Таму вось ім парада — што ты зробіш і наколькі глыбока ты разумееш гэтыя праблемы».

### «Трэба будзе скакаць»

Вяртаючыся да тэмы сельскай гаспадаркі, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што, нягледзячы на кадравыя змяненні ў гэтай галіне, асаблівага руху наперад не відаць. Пакуль, па яго словах, горш не стала, але і асабліва лепш таксама.

«Можа быць, акрамя Мінскай вобласці, — удакладніў Прэзідэнт. — Бог пашкадаваў яго (Аляксандра Турчына. — **«Зв.»**) і дапамог у многім. Уладзімір Яўгенавіч дапамог. Пабудавалі 20 комплексаў. Гэта таксама нямала. Так, мы нешта зрабілі. Вопыт у нас ёсць. Як будзем дзейнічаць далей?»

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што трэба сялянам дапамагаць. Ён канстатаваў, што людзей у сельскай мясцовасці становіцца ўсё менш. «Уладзімір Яўгенавіч (Кухараў. — **«Зв.»**) высмоктвае з сяла ўсё, што можна, у Мінску, — дадаў Прэзідэнт. — Ужо два мільёны чалавек. Усё далей і далей. Трэба каб аддача была і для сяла, бо людзей накарміць трэба. Гэтыя два мільёны ў Мінску, яны ж есці хочуць кожны дзень...»

Кажучы аб якасці беларускай прадукцыі, Аляксандр Лукашэнка паведаміў, што яму прыемна, калі ў іншых краінах запатрабаваны беларускія прадукты, а кіраўнікі дзяржаў нават просяць даслаць іх пакаштаваць. «Таму мы навучыліся гэта рабіць, але пакуль выйшлі на пэўную гарызантальную прамую і вышэй скокнуць не можам, — канстатаваў беларускі лідар. — А трэба будзе скакаць. І гэта галоўная наша задача і абяцанне беларускаму народу ў гэты перадвыбарны перыяд».

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што профільныя віцэ-прэм'ер і міністр давалі клятву скончыць палявыя работы да 7 лістапада. «Колькі ў цябе буракоў на палях, бульба, можа, дзесьці засталася, капуста, яблыкі, грушы, можа, дзесьці яшчэ боўтаюцца на дрэвах? — пацікавіўся Прэзідэнт у міністра сельскай гаспадаркі і харчавання. — Кукурузу ці ўсю ты сабраў на зерне? Зябліва, пасяўная кампанія прайшла... Як выглядаюць азімыя, якія мы быццам своечасова пасеялі?»

Характарызуючы сітуацыю на бягучы момант, Анатоль Лінеівіч пачаў з кукурузы. «Ставілі задачу да 10 лістапада сабраць на зерне, — канкрэтызаваў ён. — У нас засталося 46 тысяч гектараў усёй кукурузы».

«Колькі гэта працэнтаў ад таго, што мы планавалі на зерне сабраць?» — удакладніў Прэзідэнт.

Як паведаміў Юрый Шулейка, на зерне засталося сабраць 9 % кукурузы. Усяго, па яго словах, ужо ўбрана 98 % плошчаў, засеяных гэтай культурай. Кіраўнік дзяржавы ўдакладніў, чаму не завершаны работы ўборкі кукурузы на сілас. Яму паведамілі, што вядзецца работа на апошніх гектарах.

«Май на ўвазе, я езджу на «Дажынкі» па ўсёй краіне, — звярнуў увагу беларускі лідар. — І паглядзець, падзякаваць людзям — гэта адно. А другое, я ж гляджу, як Аляксандр Генрыхавіч (Турчын. — **«Зв.»**) выконвае маё даручэнне: арэ, якая культура земляробства ў яго і гэтак далей. Я ж убачу, што вы там кладзяце ў разоры».

Прэзідэнту паабяцалі, што за шэсцьсем дзён, пры ўмове спрыяльнага надвор'я, кукуруза поўнасцю будзе сабрана: і на зерне, і на сілас. І гэта, як заўважыў Юрый Шулейка, будзе на тыдзень раней, чым летась.

**Вераніка КАНЮТА.**

### ❍ У тэму

Як расказаў журналістам **намеснік прэм'ер-міністра Юрый ШУЛЕЙКА,** сельскагаспадарчы год фактычна завершаны. «Вынікі, абяцаныя Прэзідэнту, дасягнуты, — паведаміў ён. — Паўмільёна тон збожжа мы кладзём дадаткова ў засекі нашай краіны. Калі ёсць у нас сёння ўраджай, то гэта прадукцыя сельгасвытворчасці — мяса, малако дадатковыя. І ўсе мэтавыя паказчыкі, да якіх мы ідзём, — для вялікай скарбонкі нашай краіны».

Аб якасці, а ў сувязі з гэтым запатрабаванасці беларускай прадукцыі, па словах віцэ-прэм'ера, сведчыць тое, што львіная доля нашых прадуктаў харчавання пастаўляецца на экспарт. Апошні, як заўважыў віцэ-прэм'ер, па выніках гэтага года прагназуецца на суму 8,5 мільярда долараў.

Кажучы аб будаўніцтве малочнатаварных комплексаў, Юрый Шулейка адзначыў, што на наступны год запланавана ўзвядзенне 60 такіх комплексаў. «Яны ўжо сфарміраваны, адкрыта фінансаванне», — канкрэтызаваў віцэ-прэм'ер. Па яго словах, у найбліжэйшыя гады будзе забяспечана ўтрыманне ўсіх кароў у сучасных умовах, што паўплывае на высокую эфектыўнасць вытворчасці. Менавіта якасць канчатковай прадукцыі на сталах у людзей, як падкрэсліў намеснік прэм'ер-міністра, у немалой ступені залежыць ад умоў утрымання жывёл, іх кармлення.

Таксама Юрый Шулейка звярнуў увагу на важнасць дысцыпліны ў развіцці сельскай гаспадаркі і рэалізацыі намечаных планаў. На гэта пастаянна арыентуе і кіраўнік дзяржавы.

Па словах **міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Анатоля ЛІНЕВІЧА,** добрыя ўмовы надвор'я дазволяць аграрыям у найбліжэйшы час завяршыць асноўныя палявыя работы. «Застануцца цукровыя буракі, але да 10 лістапада пры тых тэмпах, якія сёння арганізаваны, мы справімся, — удакладніў ён, дадаўшы, што падыходзіць час таксама збіраць з палёў капусту. — Застанецца заараць зябліва». У планах да канца года — закрыць і ўсе тэхналагічныя пытанні.

Міністр адзначыў, што сёлета ўраджай збожжавых з рапсам перавысіў 10 мільёнаў тон. Разам з кукурузай, якую застаецца сабраць, выніковы каравай складзе 10 мільёнаў 250 тысяч тон збожжа.

«Тое, што гэты сельскагаспадарчы год даўся няпроста і нялёгка, гэта дакладна, — звярнуў увагу Анатоль Лінеівіч. — Увесну прыходзілася дзесьці крыху парушаць агратэхнічныя тэрміны, бо глеба ў шматлікіх абласцях была пераўвільготненая. Даводзілася аператыўна «націскаць», калі было добрае надвор'е. А з уборкай надвор'е нам спрыяе. Так што справіліся з задачай поўнасцю, плюс займелі паўмільёна тон ад агульнай лічбы ў адносінах да мінулага года».

Кажучы аб пастаўленай Прэзідэнтам задачы — узняць планку ў сельскай гаспадарцы, кіраўнік Мінсельгасхарча адзначыў, што ўвагу трэба будзе ўдзяліць развіццю раслінаводства, ад якога залежыць жывёлагадоўля. «Калі ёсць добрыя вынікі, то потым атрымаем і прыбаўленні ў вазе, і малако, — канкрэтызаваў ён. — Натуральна, настройваемся на ўраджай, вышэйшы за гэты год. Зімой будзем працаваць над планамі, назапашваннем угнаенняў, шукаць крыніцы, каб быць гатовымі да вясенніх пасяўной. Што датычыцца жывёлагадоўлі, разлічваем павялічыць удоі малака».

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Дзярждэп ЗША прыгразіў Грузіі «далейшымі наступствамі» пры такім жа курсе ўлад



Такую заяву зрабіў на рэгулярным брыфінгу для прэсы кіраўнік прэс-службы Дзярждэпартамента ЗША Мэцью Мілер, перадае ТАСС. «Сёлета мы паслядоўна звярталіся да ўрада Грузіі з заклікам адмовіцца ад антыдэмакратычных дзеянняў і вярнуцца на еўраатлантычны шлях. Мы не выключаем далейшых наступстваў, калі ўрад Грузіі не зменіць курс», — адзначыў Мілер. Афіцыйны прадстаўнік МЗС Расіі Марыя Захарава, каментуючы пагрозы ЗША ў адрас улад Грузіі, параўнала гэтыя метады з неакаланіялізмам. «Дэмакратыя, сэр, прыехалі. Наступная станцыя — неакаланіялізм», — напісала расійскі дыпламат у Telegram-канале.

### Уладальнікі судна, якое ўрэзалася ў мост у Балтыморы, выплацяць звыш 100 мільёнаў долараў



Сінгапурскія кампаніі Grace Ocean і Synergy Marine, якія валодаюць суднам, што разбурыла аўтамабільны мост у амерыканскім Балтыморы, выплацяць кампенсацыю ў памеры больш за 100 мільёнаў долараў. Аб гэтым паведаміла Міністэрства юстыцыі ЗША, інфармуе ТАСС. Як удакладнілі ў ведамстве, уладальнікі кантэйнеравоза пагадзіліся выплаціць кампенсацыю «для ўрэгулявання грамадзянскага іску». Ён быў пададзены ўладамі ЗША «з мэтай атрымання кампенсацыі выдаткаў, панесеных пры ліквідацыі катастрафічнага абвальвання моста». У Мінюсце назвалі тое, што адбылося, «адной з самых страшных транспартных катастроф за апошні час». Раней паведамлялася, што Grace Ocean ужо выплаціла каля 97 мільёнаў долараў у якасці кампенсацыі выдаткаў на работы па прадухіленні разліву нафты ў выніку сутыкнення.

### У Лондане ўкралі 22 тоны элітнага сыру



Днямі вядомая брытанская кампанія Neal's Yard Dairy паведаміла, што ў яе ўкралі 22 тоны сыру. Ашуканцы, якія выдаюць сябе за аптовых гандляроў, падманам набылі буйную партыю элітных сыроў на суму больш чым 300 тысяч фунтаў. Кампанія лічыла, што мае справу з аптовымі гандлярамі, якія пастаўляюць сыр буйному французскаму рытэйлеру. Ашуканцы паспелі атрымаць 950 кругоў сыру, перш чым высветлілася, што іх фірмы не існуе. Гэта быў элітны чэдар, паведаміла «Бі-бі-сі». Патрык Холдэн, уладальнік валійскай фермы, дзе робяць сыр, назваў тое, што адбылося, мудрагелістым трукам. Ён прызнаўся, што і ён, і Neal's Yard Dairy узрадаваліся вялікаму заказу. «Яшчэ большы шок выклікае тое, што гэта адбылося з прадуктам, увесь шлях якога ад вытворцы да канчатковага спажыўца славіцца сваёй празрыстасцю і абапіраецца на адкрытасць і давер», — падкрэсліў Холдэн.

26 студзеня 2025
ВЫБАРЫ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

# Выбары-2025: важна ведаць

**Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь прызначаны на 26 студзеня 2025 года. Такое рашэнне прынята 23 кастрычніка на пасяджэнні Палаты прадстаўнікоў. У адпаведнасці з патрабаваннямі Канстытуцыі і Выбарчага кодэкса ЦВК зацвердзіў на наступны дзень Каляндарны план арганізацыйных мерапрыемстваў па падрыхтоўцы і правядзенні выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь 26 студзеня 2025 года. Нагадаем коратка яго асноўныя пункты.**

## КАЛЯНДАР ПАДРЫХТОЎКІ І ПРАВЯДЗЕННЯ ВЫБАРАЎ-2025

**2024 Лістапад**

| Пн | Аўт | Ср | Чц | Пт | Сб | Нд |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | 1 | 2 | 3 |
| 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 |
| 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 |
| 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | |

**2024 Снежань**

| Пн | Аўт | Ср | Чц | Пт | Сб | Нд |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | 1 |
| 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 |
| 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 |
| 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 |
| 30 | 31 | | | | | |

**2025 Студзень**

| Пн | Аўт | Ср | Чц | Пт | Сб | Нд |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
| 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 |
| 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 |
| 27 | 28 | 29 | 30 | 31 | | |

**Не пазней за 31 кастрычніка 2024 г.**
Вылучэнне прадстаўнікоў у склад абласных, Мінскай гарадской, раённых, гарадскіх (у гарадах абласнога падпарадкавання, акрамя гарадоў з раённым падзелам), раённых у гарадах камісій па выбарах Прэзідэнта.

**Не пазней за 4 лістапада 2024 г.**
Вызначэнне месцаў, забароненых для правядзення пікетавання з мэтай збору подпісаў.

**Не пазней за 1 лістапада 2024 г.**
Падача ў ЦВК дакументаў, неабходных для рэгістрацыі ініцыятыўнай групы выбаршчыкаў па вылучэнні кандыдата ў Прэзідэнты.

**Не пазней за 6 лістапада 2024 г.**
Утварэнне тэрытарыяльных камісій.

**З 7 лістапада 2024 г. да 6 снежня 2024 г. уключна**
Збор подпісаў выбаршчыкаў у падтрымку вылучэння кандыдатаў у Прэзідэнты.

**Не пазней за 11 снежня 2024 г.**
Утварэнне ўчасткаў для галасавання.

**Не пазней за 20 снежня 2024 г.**
Вылучэнне прадстаўнікоў у склад участковых камісій.

**З 7 да 21 снежня 2024 г. уключна**
Падача ў ЦВК дакументаў, неабходных для рэгістрацыі кандыдатаў у Прэзідэнты.

**З 22 да 31 снежня 2024 г. уключна**
Рэгістрацыя кандыдатаў у Прэзідэнты.

**З 1 да 25 студзеня 2025 г. уключна**
Перадвыбарная агітацыя.

**З 10 студзеня 2025 г.**
Падача спісаў грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах, для азнаямлення.

**Не пазней за 15 студзеня 2025 г.**
Накіраванне выбаршчыкам паведамленняў аб часе і месцы галасавання, інфармацыі аб кандыдатах у Прэзідэнты.

**З 23 студзеня 2025 г.**
Падача спісаў грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах, для азнаямлення на ўчастках для галасавання, утвораных у месцах часовага знаходжання выбаршчыкаў (у бальніцах, санаторыях, дамах адпачынку і іншых месцах часовага знаходжання).

**21—25 студзеня 2025 г.**
Датэрміновае галасаванне на выбарах Прэзідэнта.

**26 студзеня 2025 г.**
Дзень выбараў Прэзідэнта.

**Не пазней за 5 лютага 2025 г.**
Устанаўленне ЦВК вынікаў выбараў.

**Не пазней за 9 лютага 2025 г.**
Правядзенне (пры неабходнасці) другога тура галасавання.

**У Цэнтральнай выбарчай камісіі будзе арганізавана дзяжурства супрацоўнікаў па рэжыме работы тэрытарыяльных камісій, у тым ліку і па суботах, а з 1 лістапада пачне працаваць кол-цэнтр.**

## Патрабаванні да кандыдатаў у Прэзідэнты

- грамадзянства Рэспублікі Беларусь па нараджэнні
- узрост не маладзей за 40 гадоў
- валоданне выбарчым правам
- пастаяннае пражыванне ў Рэспубліцы Беларусь не менш чым 20 гадоў непасрэдна перад выбарамі
- адсутнасць цяпер або раней грамадзянства замежнай дзяржавы альбо пасведчання на жыхарства ці іншага дакумента замежнай дзяржавы, які дае права на льготы і іншыя перавагі

Крыніца: Выбарчы кодэкс Беларусі.

## Правы кандыдатаў у Прэзідэнты

- ✓ роўнае права выступаць на перадвыбарных і іншых сходах, нарадах, пасяджэннях, у друкаваных СМІ, па радыё і па тэлебачанні
- ✓ дзяржорганы, грамадскія аб'яднанні, кіраўнікі арганізацый, органы тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання абавязаны садзейнічаць арганізацыі сустрэч кандыдатаў у Прэзідэнты з выбаршчыкамі
- ✓ права выступаць з праграмай сваёй будучай дзейнасці, тэкст якой вызначаецца кандыдатам
- ✓ мець да 30 давераных асоб

**Кандыдаты ў Прэзідэнты вылучаюцца грамадзянамі Рэспублікі Беларусь пры наяўнасці не менш як 100 тысяч подпісаў выбаршчыкаў. Вылучэнне кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь грамадзянамі ажыццяўляецца ініцыятыўнай групай выбаршчыкаў у колькасці не менш чым 100 чалавек.**

## Выбарчыя фонды

**асоб, якія вылучаюцца кандыдатамі ў Прэзідэнты, і кандыдатаў у Прэзідэнты могуць фарміравацца за кошт:**

1) уласных грашовых сродкаў асобы, якая вылучаецца кандыдатам у Прэзідэнты, кандыдата, памер якіх не можа перавышаць гранічную суму ўсіх выдаткаў са сродкаў выбарчага фонду, названую ніжэй;

2) добраахвотных ахвяраванняў грамадзян Рэспублікі Беларусь — не больш чым 30 базавых велічыняў;

3) добраахвотных ахвяраванняў юрыдычных асоб — не больш чым 60 базавых велічыняў.

Гранічная сума ўсіх выдаткаў са сродкаў выбарчага фонду кандыдата ў Прэзідэнты не можа перавышаць 10 000 базавых велічыняў.

**Напярэдадні дня выбараў традыцыйна пачне работу Інфармацыйны цэнтр Цэнтральнай выбарчай камісіі з мэтай аператыўнага інфармавання выбаршчыкаў і назіральнікаў аб ходзе галасавання.**

## ЗАБАРАНЯЕЦЦА

**уносіць ахвяраванні ў выбарчыя фонды:**

- ✓ замежным дзяржавам і арганізацыям;
- ✓ замежным грамадзянам і асобам без грамадзянства;
- ✓ міжнародным арганізацыям;
- ✓ арганізацыям, заснавальнікамі (удзельнікамі, уласнікамі маёмасці) якіх з'яўляюцца замежныя дзяржавы, замежныя арганізацыі, міжнародныя арганізацыі, замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства;
- ✓ арганізацыям, якія атрымлівалі на працягу года, што папярэднічаў дню ўнясення ахвяравання, замежную бязвыплатную дапамогу ад замежных дзяржаў у асобе іх дзяржаўных органаў або дыпламатычных прадстаўніцтваў, міждзяржаўных утварэнняў, замежных і міжнародных юрыдычных асоб (арганізацый, якія не з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі), грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія пастаянна пражываюць за межамі Рэспублікі Беларусь альбо знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь больш за 183 дні на працягу 12 месяцаў, якія папярэднічалі месяцу аказання замежнай бязвыплатнай дапамогі, замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, якія не маюць дазволу на пастаяннае пражыванне ў Рэспубліцы Беларусь, а таксама ад замежных ананімных ахвяравальнікаў, калі атрыманая гэтымі арганізацыямі замежная бязвыплатная дапамога не была імі вернута або ў выпадку немагчымасці вяртання не была пералічана (перададзена) у даход дзяржавы да дня ўнясення ахвяравання ў выбарчыя фонды;
- ✓ грамадзянам Рэспублікі Беларусь, якія не дасягнулі 18 гадоў;
- ✓ дзяржаўным органам і органам мясцовага самакіравання;
- ✓ арганізацыям, якія цалкам або часткова фінансуюцца з бюджэту;
- ✓ арганізацыям, зарэгістраваным ва ўстаноўленым парадку менш як за адзін год да дня ўнясення ахвяравання;
- ✓ дабрачынным і рэлігійным арганізацыям;
- ✓ ананімным ахвяравальнікам.

Міжнародныя стасункі

# УЗАЕМАРАЗУМЕННЕ, УЗАЕМАВЫРУЧКА І СЯБРОЎСТВА

## Ігар СЕРГЯЕНКА сустрэўся з сербскай парламенцкай дэлегацыяй

**Беларускія і сербскія парламентарыі абмеркавалі актуальныя пытанні міжпарламенцкага ўзаемадзеяння і перспектывы нарошчвання ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва ў эканамічнай сферы. У складзе балканскай дэлегацыі — віцэ-спікер Народнай скупшчыны Рэспублікі Сербія Ёван ЯНІЧ, дэпутаты ад розных палітычных партый, восем з якіх — члены групы сяброўства з Беларуссю, прадстаўнікі бізнес-колаў Сербіі і свяшчэннікі, усяго больш за 30 чалавек.**

На пачатку сустрэчы Старшыня Палаты прадстаўнікоў зазначыў, што беларускі бок вельмі рады сустрэцца з такой прадстаўнічай дэлегацыяй сербскага парламента. Гэты візіт — сведчанне важнасці міжпарламенцкага супрацоўніцтва для эфектыўнага развіцця і паглыблення беларуска-сербскіх адносін. «Яны (адносіны. — **«Зв.»**) грунтуюцца на прынцыпах узаемаразумення, узаемавыручкі, дружбы і, што самае важнае, на высокім узроўні даверу паміж лідарамі нашых дзяржаў, паміж нашымі прэзідэнтамі», — падкрэсліў Ігар Сергяенка.

Звярнуў ён увагу і на тое, што цяперашняя сустрэча праходзіць напярэдадні знамянальнай для абедзвюх краін падзеі — 30-годдзя ўстанаўлення дыпламатычных адносін. Па словах спікера, за гэтыя гады Сербія стала для Беларусі ключавым партнёрам на Балканах, ідзе актыўны дыялог як на міждзяржаўным узроўні, так і па лініі парламентаў. Ігар Сергяенка адзначыў, што прававая аснова міжпарламенцкага ўзаемадзеяння была закладзена яшчэ ў 2015 годзе, быў падпісаны Мемарандум аб супрацоўніцтве паміж Нацыянальным сходам Рэспублікі Беларусь і Народнай скупшчынай Рэспублікі Сербія.





Таму зразумела, што кантакты з сербскімі парламентарыямі адбываюцца не ўпершыню, больш таго — апошнім часам назіраецца іх актывізацыя. Так, 9 верасня 2024 года ў Палаце прадстаўнікоў адбылася сустрэча намесніка старшыні Палаты прадстаўнікоў Вадзіма Іпатава з сербскай парламенцкай дэлегацыяй на чале з Ёванам Янічам, на якой была дасягнута дамоўленасць аб актывізацыі дзейнасці парламенцкіх груп дружбы. 16 кастрычніка прайшла сустрэча Ігара Сергяенкі з Паўнамоцным Паслом Сербіі ў Беларусі Ілінай Вукайловіч, на якой таксама ішла размова аб актывізацыі ўзаемадзеяння паміж краінамі.

«Гэта сведчыць аб інтэнсіфікацыі нашых кантактаў. І гэта выдатна. Сёння ў нас ёсць цудоўная магчымасць абмеркаваць пытанні нашага і парламенцкага ўзаемадзеяння і ў цэлым любыя іншыя тэмы, якія датычацца супрацоўніцтва Беларусі і Сербіі ў розных кірунках», — зўважыў Ігар Сергяенка. Выказаў ён і словы падзякі ганароваму консулу Рэспублікі Беларусь у Бялградзе Драгаміру Карычу за ўклад у развіццё беларуска-сербскіх адносін. За гэта Драгамір Карыч у свой час быў удастоены падзякі Прэзідэнта Беларусі.

Ёван Яніч, у сваю чаргу, пагадзіўся з тэзісамі Старшыні Палаты прадстаўнікоў аб неабходнасці далейшага паглыблення і пашырэння супрацоўніцтва паміж парламентамі Беларусі і Сербіі. «Супрацоўніцтва паміж парламентамі адкрывае дзверы для супрацоўніцтва ў эканоміцы, культуры, адукацыі, ва ўсіх іншых галінах. Беларусь — гэта дружалюбная, брацкая краіна для Сербіі, і мы хочам гэта братэрства ўмацоўваць і пашыраць», — падкрэсліў ён і дадаў, што супрацоўніцтва нашых краін мае глыбокія гістарычныя карані. «Мы з радасцю можам канстатаваць, што двухбаковыя адносіны развіваюцца ва ўсіх абласцях на падставе традыцыйнай духоўнай, культурнай і моўнай блізкасці», — канстатаваў Ёван Яніч.

Асобна віцэ-спікер Народнай скупшчыны адзначыў Прэзідэнта Беларусі, які карыстаецца вялікай павагай у Сербіі. «Мы заўсёды падкрэсліваем, што ў нас дружалюбныя адносіны з Беларуссю і асабліва з Прэзідэнтам Аляксандрам Лукашэнкам, — сказаў Ёван Яніч. — Аляксандр Лукашэнка надзвычайна папулярны ў Сербіі і карыстаецца вялікай павагай. Таму што там яго ведаюць як лідара, які паспяхова кіруе сваёй краінай. Акрамя таго, ён вялікі сябар Сербіі, што ён паказаў у многіх абставінах. Ён быў адзіным кіраўніком дзяржавы, які прыехаў у Бялград, калі мы падвергліся агрэсіі НАТА. Мы цэнім падтрымку Беларусі ў адносінах да Сербіі ў рамках міжнародных арганізацый».

Таксама віцэ-спікер сербскага парламента зазначыў, што сербскі бок, безумоўна, нацэлены на ўмацаванне сяброўскіх адносін з нашай краінай.

**Уладзімір ВЯРЭНІЧ.**
**Фота БелТА.**

Падзея

# У будынку валожынскай іешывы пасля рэканструкцыі адкрыўся музей

**Днямі пасля рэканструкцыі адкрыў дзверы будынак былой Валожынскай іешывы. Ва ўрачыстай цырымоніі ўзяў удзел старшыня Мінскага аблвыканкама Аляксандр ТУРЧЫН.**

Работы па рэканструкцыі працягваліся каля года: за гэты час аб'ект цалкам абнавілі, унутры зрабілі культурна-адукацыйны цэнтр. «Калі я ўпершыню зайшоў сюды, то ўбачыў, што стан аб'екта не самы лепшы. Тады прыйшло разуменне, што трэба нешта рабіць, каб захаваць гісторыю нашай краіны, — адзначыў Аляксандр Турчын. — Валожын — гэта ўнікальнае месца: нягледзячы на тое, што праз Беларусь ішлі ўсе войны, яму ўдалося захаваць такія аб'екты, як іешыва, касцёл, палацава-паркавы комплекс Тышкевічаў.

Старшыня аблвыканкама дадаў, што іешыва не апошняя ў спісе аднаўлення гістарычных будынкаў, каб людзі не толькі з нашай краіны, але і з усяго свету мелі магчымасць прыязджаць у Валожын.

**Старшыня савета дырэктараў сумеснага ЗАТ «Сервалюкс» Яўген БАСКІН.** — Мы бачым фантастычны музей, роўных якому, на мой погляд, у краіне няма».

«Я нашчадак яўрэяў Усходняй Еўропы, — падзяліўся **часовы паверраны ў справах дзяржавы Ізраіль у Рэспубліцы Беларусь Цві МІРКІН,** — І гэтая іешыва з'яўляецца часткай тых традыцый, з якіх выйшла мая сям'я. Таму рады як ізраільцянін і як афіцыйны прадстаўнік дзяржавы адкрыццю гэтага аб'екта. Гэта і захаванне памяці пра найбагацейшыя традыцыі, і пра культуру людзей, якіх хацелі знішчыць шматкроць і немалымі намаганнямі. І тое, што тут адбываецца, сведчыць: гэтая памяць працягвае жыць. Шчыра жадаю музею далейшага развіцця».

**Равін Віцебскай рэлігійнай абшчыны Малкіэль ГАРГОДЗЭ** адзначыў, што быў у Валожыне 20 гадоў таму і тады ўпершыню ўбачыў іешыву: «Важна разумець, што для ўсіх нас гэта месца асаблівае. Гэта маці іешыў усяго свету, гэта сцэны, якія выпусцілі ў свет асаблівых



Кіраўнік Мінішчыны адзначыў, што цяпер трэба папрацаваць над напаўненнем аб'екта, прыцягваючы да агульнай справы гісторыкаў, бізнесменаў, палітыкаў: «І гэтая работа ў нас яшчэ наперадзе. І планаў па захаванні гістарычнай спадчыны Мінскай вобласці шмат».

Па меркаванні Аляксандра Турчына, Валожын — гэта Беларусь у мініяцюры, дзе ёсць іешыва, касцёл, праваслаўная царква: «Гэта сімвалізуе тое, што ў нашай краіне людзі розных канфесій заўсёды жылі і выжывалі разам, не ваюючы. Таму так важна тое, што робіць дзяржава для захавання міжканфесійнага, ды і проста міру, тое, што робіць наш Прэзідэнт, калі вакол такая неспакойная абстаноўка, а мы ўсё ж такі адкрываем такія выдатныя аб'екты».

Старшыня Мінскага аблвыканкама падкрэсліў, што Валожынская іешыва — частка гісторыі нашай краіны: «Яна была розная, але, тым не менш, без мінулага не бывае будучыні. І адна з найважнейшых задач дзяржавы — захоўваць сваю гісторыю, што мы і робім».

«Для мяне вялікі гонар вярнуць гэту святую кнігу ў сцэны калісьці рэлігійнай навучальнай установы, — сказаў **стар-**

людзей, вялікіх равінаў, якія аказалі вялікі ўплыў на яўрэйскі свет. І калі сёння вы бачыце якую-небудзь іншую іешыву ў іншым месцы, гэта адсюль, з гэтых сцэн. Таму хацелася б падзякаваць усім, хто ўдзельнічаў у адраджэнні святыні яўрэйскага народа і беларускай зямлі».

Пасля ён абвясціў пра пачатак малітвы, уключаючы памінальную, перад унясеннем скрутка Торы. Яе рэдкі экзэмпляр, набыты за сродкі спонсараў, быў прывезены ў Валожын з Ізраіля і змешчаны ў сінагагальны каўчэг.

Пасля заканчэння цырымоніі старшыня Мінскага аблвыканкама пакінуў запіс у кнізе ганаровых гасцей — першую ў гісторыі абноўленай Валожынскай іешывы. Ён выказаў упэўненасць, што музей будзе карыстацца папулярнасцю і прымаць не толькі шматлікіх турыстаў, але і ўсіх, хто неабыякавы да гісторыі краіны.

Цяпер іешыва ў Валожыне з'яўляецца аб'ектам рэлігійнага і пазнавальнага турызму ў нашай краіне, уваходзіць у экскурсійныя туры, туры выхаднога дня, а таксама з'яўляецца аб'ектам паломніцтва яўрэяў свету.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ, фота аўтара.**
*г. Валожын.*

Падпіска-2024

# Добрая рэч у гаспадарцы заўжды спатрэбіцца

Красамоўныя лічбы: вось ужо другое стагоддзе (!) газета «Звязда» прыходзіць да сваіх чытачоў, яна ж каля трох дзесяцігоддзяў радуе іх не толькі роднай мовай, патрэбнай інфармацыяй, сустрэчамі з цікавымі людзьмі, парадамі, гумарам, але і каштоўнымі прызамі.

Надоечы адбыўся чарговы розыгрыш сярод тых, хто застаўся з нашай газетай да канца года.

**Сокавыціскалку электрычную Kitfort KT-1150-1 выйгралі:**

Пратасевіч Марыя Ігнатаўна, аг. Хомск Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці;

Уродава Алена Аляксандраўна, г. Орша Віцебскай вобласці;

Крацік Алена Уладзіміраўна, г. Гомель;

Бяроза Дзіяна Віктараўна, г. Слонім Гродзенскай вобласці;

Жыбуль Станіслаў Антонавіч, в. Плашава Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці;

Падальхоў Леанід Пятровіч, аг. Мазолава Мсціслаўскага раёна Магілёўскай вобласці;

Дзмітрыеў Аляксандр Барысавіч, г. Мінск.

**Суперпрыз — сушылку для агародніны і садавіны Kitfort KT-FP-1940 — выйграла**

Жарко Валянціна Дзмітрыеўна, аг. Бporльнікі Навагрудскага раёна Гродзенскай вобласці.

Нашы віншаванні тым, каму пашчасціла!

Калі ж НЕ (і на гэты раз), ведайце, што новая падпісная кампанія не за гарамі. А значыць, на звычным месцы (у пятнічных нумарах газеты, на першай старонцы тэлепраграм) ізноў з'явяцца знаёмыя купоны. Адзін з якіх, аформіўшы падпіску, зусім нескладана запоўніць і даслаць у рэдакцыю. А там...

Як казалі нашы продкі, зрабі, што можаш, а ў астатнім даверся лёсу.

**Афіцыйна:**

**Арганізатарам рэкламнай гульні «Смачная восень са «Звяздой» з'яўляецца рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (УНП 100155376), размешчаная па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.**

**Рэкламная гульня «Смачная восень са «Звяздой» праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь з 1 верасня па 31 снежня 2024 года ўключна сярод падпісчыкаў газеты «Звязда» на чацвёрты квартал або другое паўгоддзе 2024 года. Усяго ў гульні ўзялі ўдзел 52 падпісчыкі. Прызавы фонд гульні разыграны цалкам.**

**Тэлефон для даведак па пытаннях правядзення рэкламнай гульні і атрымання прызоў 8 (017) 271 81 53.**


**ИЗВЕЩЕНИЕ акционерам ЗАО «УКХ «БелГАЗавтосервис»**

Настоящим информируем о поступлении 21.10.2024 г. от общества с ограниченной ответственностью «БелГАЗавтосервис-НН» (местонахождение: 603024, Российская Федерация, Нижегородская обл., г. Нижний Новгород, ул. Дунаева, д. 17, помещение 4) извещения о намерении продать принадлежащие ему простые (обыкновенные) акции ЗАО «УКХ «БелГАЗавтосервис» в количестве 2 100 000 (два миллиона сто тысяч) штук за 61 635 000 российских рублей (шестьдесят один миллион шестьсот тридцать пять тысяч рублей) с оплатой в российских рублях путем зачисления денежных средств на расчетный счет продавца не позднее 90 (девяноста) дней, следующих за днем зачисления акций на счет «депо» покупателя.

Акционерам ЗАО «УКХ «БелГАЗавтосервис», желающим воспользоваться своим преимущественным правом покупки продаваемых акций на вышеуказанных условиях, необходимо сообщить об этом ЗАО «УКХ «БелГАЗавтосервис» по адресу: 220014, г. Минск, пр-т Жукова, 44, каб. 502, а также ООО «БелГАЗавтосервис-НН» по адресу: 603065, Российская Федерация, Нижегородская обл., г. Нижний Новгород, ул. Переходникова, д. 6.

УНП 100123046

Напярэдадні

# ПРЭЗЕНТАВАЦЬ КРАІНУ ПРАЗ ПРЫГАЖОСЦЬ

**Упершыню прадстаўніца Беларусі возьме ўдзел у прэстыжным міжнародным конкурсе прыгажосці «Міс Сусвет — 2024». Нашу краіну на ім прадставіць пераможца нацыянальнага конкурсу прыгажосці «Міс Беларусь — 2023» Элеанора КАЧАЛОЎСКАЯ. Днямі карэспандэнт «Звязды» сустрэлася з ёй і яе камандай у Нацыянальнай школе прыгажосці, каб даведацца, як ідзе падрыхтоўка, у якіх вобразах выступіць беларуска ў Мексіцы і што хоча данесці да ўдзельнікаў, членаў журы і ўсіх тых, хто будзе назіраць за маючым адбыцца конкурсам.**



— «Міс Сусвет — 2024» сёлета пройдзе ў горадзе Мехіка з 30 кастрычніка да 16 лістапада, — расказала **дырэктар — мастацкі кіраўнік Нацыянальнай школы прыгажосці Бажэна ЯРОМІЧ.** — На працягу ўсяго гэтага перыяду ўдзельніцам трэба прайсці розныя конкурсныя выпрабаванні. У тым ліку ацэнку дабрачынных праектаў, якія прадстаўніцы кожнай краіны рэалізоўвалі на сваёй Радзіме. Наша прадстаўніца абрала тэму сацыялізацыі дзяцей з асаблівасцямі развіцця. Адметным з'яўляецца і тое, што рэалізацыя гэтага праекта пачалася задоўга да падрыхтоўкі да сусветнага конкурсу прыгажосці — пасля таго, як Элеанора стала пераможцай «Міс Беларусь — 2023», — падзялілася падрабязнасцямі яна.

Прэфінал конкурсу прыгажосці адбудзецца 14 лістапада. Адным з асноўных яго элементаў стане выхад Элеаноры ў express-кактэйльнай сукенцы. На наступны дзень чакаецца выхад і конкурснае выпрабаванне ў нацыянальным касцюме, які, па задумцы міжнародных арганізатараў, павінен быць не традыцыйным, а сцэнічным. Варта адзначыць, што асноўная задача, якая ставілася перад прадстаўніцамі кожнай краіны на гэтым этапе, — перадаць праз касцюм мясцовыя культуру і традыцыі.

Мастак Лідзія Малашэнка сумесна з камандай распрацоўвала ідэю нацыянальнага касцюма для Элеаноры і распавяла, што, згодна з рэгламентам, сімвалам або элементам ад кожнай краіны могуць быць архітэктурныя аб'екты, прыродны ці жывёльны свет, рэлігійныя сімвалы. «Мы выбралі прыродныя аб'екты, таму ўзялі за аснову сімвал папараць-кветкі, — адзначыла мастачка. — Што датычыцца зялёнага колеру, паняцце колератыпу ў сучаснай каларыстыцы вельмі неадназначнае, скажам, не любы зялёны падыходзіць усім, але можна падабраць такое яго адценне, якое падыдзе пэўнаму чалавеку, таму ніякіх пытанняў з гэтым падчас выбару не ўзнікала. Гэта высакародны колер, таму мы выбралі менавіта яго».

У выніку атрымаўся шыкоўны вобраз з тысячамі стразаў і фарбаў. Гэта практычна нятканы касцюм, хутчэй разнавіднасць бутафорыі. Майстры выкарысталі гнуткія матэрыялы, якія не ламаюцца ў працэсе транспарціроўкі, таму што касцюм павязе наша прадстаўніца самастойна. Дзеля гэтага яго зрабілі разборным, элементы складаныя, але ніякіх цяжкасцяў, паабяцалі вытворцы, не ўзнікне.

**Дызайнер Ягор КІРЫЧЭНКА** таксама добра знаёмы з Элеанорай. Яны разам стварылі сукенкі на конкурс «Міс Беларусь — 2023», а пасля — на «Міс Еўропа Кантыненталь — 2023». Таму калі агучылі задачу стварыць вобраз для яе фінальнага выхаду на «Міс Сусвет», то каманда з трапятаннем паставілася да яе, звяртала ўвагу цяпер не толькі на візуальнае афармленне, але і на зручнасць.

Па словах дызайнера, сукенка для фінальнага выхаду створана ў вогненна-чырвоным колеры. «Мы працягнулі гісторыю з папараць-кветкай. Звычайна фіналісткі выкарыстоўваюць бліскучыя тканіны і светлыя адценні, але мы вырашылі сысці ў кантраст. Элеанора — уладальніца ўзрушальнай прыроднай прыгажосці, і чырвоны колер яе вельмі падкрэслівае, дапамагае вылучыцца і зрабіць яркі акцэнт».

Сёння ў Мехіка разам з Элеанорай Качалоўскай адправіцца ўсяго адзін чалавек — **мастак-стыліст Нацыянальнай школы прыгажосці Ганна КАВАЛЁВА.** Напярэдадні яна расказала, што гэтым разам акцэнт будзе зроблены менавіта на сукенках Элеаноры, таму макіяж, плануецца, будзе выкананы ў нюдавым стылі. «Мы выступаем за натуральную прыгажосць», — дадала яна.

— Калі я даведалася, што буду прадстаўляць Беларусь на конкурсе «Міс Сусвет», мне прыйшла ў галаву думка: мы будзем скараць космас другі раз, — расказала Элеанора Качалоўская. — Паляцець у Мексіку, каб прадстаўляць нашу краіну на такім маштабным конкурсе, гэта, так бы мовіць, пісаць гісторыю тут і цяпер. Што датычыцца складанасцяў, здаецца, наш тандэм працаваў у гармоніі, таму што ўсе разумелі мэту і ідэю. Мы павінны паказаць праз касцюмы і падачу культурны код Беларусі і нашу ідэнтычнасць. Конкурс прыгажосці — гэта хутчэй пра цэласнасць і гатоўнасць каманды прадэманстраваць праз розныя элементы тое, чым багата наша краіна. Са мной разам паляціць у Мексіку стыліст, які і будзе маёй маральнай падтрымкай і апорай. Мяне рыхтуюць да тых умоў, каб я магла сама спраўляцца з усімі перашкодамі на сваім шляху. Але, упэўнена, перашкоды будуць мінімальныя. Касцюм зашпіліць сама дакладна змагу! Асноўная мэта, якую мы перад сабой паставілі і да якой рухаемся, — годна прадставіць нашу краіну. Мая місія — паказаць Беларусь такой, якая яна ёсць: чыстай і светлай.

Упэўнены, у Элеаноры ўсё атрымаецца! Жадаем поспехаў!

**Яна ВАЛАСАЧ, фота аўтара.**

# ЗНІЗІЦЬ АВАРЫЙНАСЦЬ І ТРАЎМАТЫЗМ

### Колькасць ДТЗ расце

Колькасць здарэнняў з удзельнікамі дарожнага руху, якія перамяшчаюцца на сродках персанальнай мабільнасці, толькі з пачатку гэтага года ўзрасла практычна на 70 працэнтаў. У сувязі з гэтым МУС прыняло рашэнне больш дэталёва ўрэгуляваць удзел у дарожным руху грамадзян на СПМ.

— У 69 выпадках пацярпелі 74 чалавекі. І гэта толькі тыя здарэнні, калі чалавек на СПМ сутыкаецца з механічным транспартам. Але не варта забывацца і на выпадкі, якія звязаны з сутыкненнямі з пешаходамі, і на іншыя выпадкі траўміравання: не прытрымліваўся хуткасці, не ўтрымаў раўнавагу і ўпаў, — расказаў **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення Дзяржаўнай аўтамабільнай інспекцыі міліцыі грамадскай бяспекі Міністэрства ўнутраных спраў Аляксандр ЗАНІМОН.**

Да таго ж у апошнія гады адзначаецца рост хуткасці перамяшчэння на СПМ і павелічэнне іх габарытаў. І тое, і другое не толькі стварае нязручнасці для іншых удзельнікаў дарожнага руху, але і цягне пэўную небяспеку. Калі гаворка ідзе пра электрасамакат, невялікую прыладу, якая рухаецца па веласіпеднай дарожцы ці тратуары, гэта адна пагроза для бяспекі. Калі ж размова ідзе пра больш буйныя сродкі, іх маса і габарыты ствараюць вялікую пагрозу для іншых удзельнікаў дарожнага руху, у першую чаргу для пешаходаў. І хуткасць, і маса гэтых сродкаў, як правіла, маюць больш сур'ёзныя наступствы, чым проста сінякі.

Змяненні ў ПДР заклікаcreateАны вырашыць дадзеную праблему.

— Мы разумеем, што колькасць СПМ будзе павялічвацца, актыўна будуць выкарыстоўвацца як практычныя, так і набытыя ва ўласнасць прыстасаванні. У найбліжэйшыя гады колькасць так званага «зялёнага» транспарту будзе расці. І тут варта разумець, што будзе ўзрастаць і колькасць здарэнняў з ім, таксама як і ў свой час павелічэнне колькасці механічных транспартных сродкаў пацягнула ўсплёск колькасці здарэнняў, — дадаў Аляксандр Занімон. Таму цяпер робіцца прыкладна папераджальныя крокі, каб знізіць рост аварыйнасці і зменшыць колькасць здарэнняў.

Частка змен накіравана на вызначэнне таго, што будзе адносіцца да сродку персанальнай мабільнасці. І тут пры іх набыцці трэба ўсё добра ўзважыць.

— У інтэрнэце шмат рэкламы падобных да СПМ прыстасаванняў, якія па сваіх характарыстыках і канструкцыі больш падобныя да мапедаў ці матацыклаў. Пры гэтым прадаўцы такіх транспартных сродкаў запэўніваюць, што іх рэгістрацыя ў ДАІ і правы на кіраванне не патрабуюцца. І пры кіраванні імі супрацоўнікі ДАІ не змогуць чыніць ніякіх перашкод. Але тое, што такія транспартныя сродкі не могуць быць зарэгістраваны ў ДАІ, не гаворыць аб тым, што да іх не павінна прад'яўляцца ніякіх патрабаванняў. Варта нагадаць, што рэгістрацыя такіх транспартных сродкаў прадугледжана ў выпадку адпаведнасці пэўным умовам, якія замацаваны на міжнародным узроўні. Ёсць тэхнічны рэгламент Мытнага саюза, які прадугледжвае пэўныя патрабаванні да бяспекі колавых транспартных сродкаў, — падкрэсліў Аляксандр Занімон.

Ён прывёў прыклад, што на многіх СМП ёсць абмежаванні хуткасці — 25 км/г, і прадаўцы кажуць, што рэгістрацыя ў ДАІ і правы кіроўцы не патрабуюцца. Аднак большасць такіх сродкаў дазваляюць развіваць вышэйшую хуткасць, бо абмежаванне максімальнай хуткасці рэгулюецца на праграмным узроўні, і для таго, каб пераключыць хуткасць з 25 км/г на 40 км/г, трэба націснуць усяго дзве кнопкі.

### СМП можа стаць мапедам

Аляксандр Занімон параіў вельмі ўважліва ставіцца да набыцця СПМ, бо, купіўшы іх сёння, можа аказацца, што заўтра чалавек іх выкарыстоўваць не зможа.

— Вы павінны разумець, што трэба атрымаць права кіравання такой прыладай, калі яна трапляе пад вызначэнне «мапед», мець адпаведную экіпіроўку, у прыватнасці шлем, выконваць тыя правілы дарожнага руху, якія прадугледжаны для гэтай катэгорыі ўдзельнікаў дарожнага руху, — параіў намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення, дадаўшы, што грамадзяне даволі актыўна адгукнуліся на абмеркаванне нованвядзенняў. Яны атрымліваюць прыкладна столькі ж заўваг і прапаноў, як і папярэднія рэдакцыя ПДД, якая таксама выносілася на грамадскае абмеркаванне.

Што датычыцца прапановы спешвання веласіпедыстаў пры перасячэнні праезнай часткі, то яна пакуль шырока абмяркоўваецца.

— ПДД — гэта заўсёды кампраміс паміж удзельнікамі дарожнага руху і пастаянны пошук аптымальнага выхаду для ўсіх катэгорый удзельнікаў. Тут ёсць канфлікт інтарэсаў паміж веласіпедыстамі, пешаходамі і кіроўцамі транспартных сродкаў. Паводле абмеркаванняў на праававым партале, большасць меркаванняў за тое, каб захаваць дзейную рэдакцыю. Аднак іх пераважна выказалі тыя, хто ездзіць на веласіпедзе. Кіроўцы, наадварот, кажуць, што складана стала ездзіць, бо веласіпедысты раптоўна выскокваюць на пераход і цяжка ў такой сітуацыі прадухіліць наезд. Спадзяюся, кампраміс мы знойдзем. Думаю, што будзем абмяркоўваць яшчэ не адзін раз і ў дастаткова шырокім коле спецыялістаў і ўдзельнікаў дарожнага руху, — рэзюмаваў Аляксандр Занімон.

### Ніводны пералом не заканчваецца поўным выздараўленнем

**Урач-траўматолаг-артапед прыёмнага аддзялення ДУ «РНПЦ траўматалогіі і артапедыі» Андрэй ЯРАШЭВІЧ** расказаў, што пераважна траўмы атрымлівае найбольш актыўная частка насельніцтва — маладыя людзі, мужчыны ва ўзросце ад 20 да 50 гадоў і жанчыны, у сілу сваёй фізіялогіі, у больш старэйшым узросце. І лічбы траўматызму растуць.

— У нашу траўматалагічную тэрміналогію ўварвалася паняцце «траўматызм, звязаны са сродкам персанальнай мабільнасці». Траўмы, атрыманыя пры сутыкненні з электрасамакатам, электравеласіпедам, нашмат больш сур'ёзныя, чым траўмы, атрыманыя пры сутыкненні пешахода са звычайным веласіпедыстам. Справа тут у большай ступені ў масе, а не ў хуткасці руху, — адзначыў Андрэй Ярашэвіч.

Часцей за ўсё пры сутыкненні церпяць найбольш уразлівыя часткі цела: ніжнія і верхнія канечнасці. Калі гэта ніжнія канечнасці, то пераважна пакутуе галёнкаступнёвы сустаў і ступня, пры падзенні на верхнія канечнасці — прамянёвазапясцевы і плечавы сустаў. Людзі таксама часта атрымліваюць чэрапна-мазгавыя траўмы, звязаныя з пашкоджаннем цэласнасці галаўнога мозгу і чэрапа твару.

З пачатку года ў прыёмнае аддзяленне РНПЦ траўматалогіі і артапедыі звярнуліся больш як 70 чалавек. Летась гэта колькасць была меншая. Толькі за апошні тыдзень дапамога была аказана пяці пацыентам з такімі траўмамі.

— Да нас паступаюць не толькі з траўмамі пасля сутыкненняў, але і пры падзеннях з СПМ. Яны ўзнікаюць з-за пераацэнкі сваіх магчымасцяў і неасцярожнасці. Тут варта ўказаць на тое, што ў агульнай структуры траўматызму 30 працэнтаў траўм людзі атрымліваюць у стане алкагольнага ап'янення. Часцей за ўсё пацыенты ў такіх выпадках паступаюць у траўмапункты ў позні вячэрні ці начны час. У стомленым стане ці, наадварот, пасля вясёлага баўлення часу чалавеку не хочацца ісці пешшу, і ён становіцца на самакат, а яны як прыманкі раскіданы па ўсім горадзе, — звярнуў увагу Андрэй Ярашэвіч.

Пры гэтым траўмы бываюць розныя. Добра, калі гэта проста ўдар. Аднак нават любы ўдар або драпіна могуць пацягнуць пэўныя наступствы. Гэта можа быць пранікненне інфекцыі, парушэнне функцыі канечнасці або пералом.

— Ні адзін пералом яшчэ не скончыўся поўным выздараўленнем. Любая такая траўма — гэта частковая страта функцый канечнасці. Часцей за ўсё траўміруюць буйныя трубчастыя косці: галёнка, плячо і косці перадплечча, якія з'яўляюцца неабходнымі ў нашым паўсядзённым жыцці, — падкрэсліў урач.

Андрэй Ярашэвіч выказаў меркаванне, што заканадаўчая база павінна быць больш дасканалай. Любое лячэнне, а часцей за ўсё яно стацыянарнае, вельмі затратнае. Тыя ж металаканструкцыі, якія прыходзіцца ўжыўляць, не танныя.

— Часта дарослыя дазваляюць непаўнагадоваму паспрабаваць пракаціцца на СМП у сваёй прысутнасці, у выніку дзіця атрымлівае пералом, а гэта аднаўленне функцыі канечнасці на працягу некалькіх гадоў, абмежаванні ў выбары прафесіі і зняняткаў спортам і інш. Хацелася б, каб заканадаўства прадугледжвала страхавое пакрыццё траўм за кошт тых арэндных арганізацый, якія пастаўляюць такія паслугі. Тым больш што лёгка адсочваецца, дзе і як гэты сродак быў узяты напракат, — выказаў меркаванне ўрач.

**Алена КРАВЕЦ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Тонкасці прафесіі

# СЯМЕЙНЫ ВЫБАР

## Ваенныя сувязісты Міхаіл і Дар'я КОПЫЛЫ — пра шлях да мары і асаблівасці сумеснай службы

**20 кастрычніка войскам сувязі споўнілася 105 гадоў. Унёсак воінаў-сувязістаў у гады Вялікай Айчыннай вайны ўвайшоў у гісторыю як прыклад самаахвярнасці і гераізму. У сённяшніх ваенных спецыялістаў не менш важныя задачы: забяспечыць бесперабойнай якаснай сувяззю войскі як падчас баявой падрыхтоўкі, так і ў перыяд паўсядзённай службы.**



Дарэчы, гэта адна з тых воінскіх прафесій, якую з задавальненнем выбіраюць дзяўчаты. Нярэдка ў войсках сувязі маюць працяг афіцэрскія дынастыі, служаць цэлымі сем'ямі. У гэтым пераканаліся і карэспандэнты «Звязды», якія днямі наведалі 86-ю брыгаду сувязі.

### ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ СУВЯЗЬ, ЗАХАВАЦЬ ТЭХНІКУ І ПАДЗЯЛІЦЦА ВОПЫТАМ

У гэтай воінскай часці Міхаіл і Дар'я Копылы служаць другі год. Прыйшлі сюды пасля заканчэння ваеннага факультэта БДУІР. Прызнаюцца, што ім вельмі пашанцавала вучыцца і служыць разам. Праўда, за ўвесь службовы дзень яны могуць нават не сустрэцца. Затое разуменне таго, што побач родны чалавек, які заўсёды дапаможа і падтрымае, павышае настрой і, безумоўна, станоўча ўплывае на працаздольнасць.





Міхаіл расказвае, што адразу не планаваў звязаць сваё жыццё з арміяй. Малады чалавек збіраўся паступаць на грамадзянскі факультэт БДУІР, але ў апошні час падаў дакументы на ваенны факультэт на спецыяльнасць «Інфакамунікацыйныя тэхналогіі», аб чым ніколі не пашкадаваў.

Міхаіл родам з Кобрына. З арміяй, увогуле сілавымі структурамі, ніхто з родных не быў звязаны, калі не лічыць тэрміновую службу бацькі. Але сям'я падтрымала выбар сына. Што такое сапраўднае армейскае жыццё, Міхаіл даведаўся ў першы месяц навучання — калі трапіў на пачатковую ваенную падрыхтоўку, якую, дарэчы, праходзяў у брыгадзе, дзе яны цяпер з жонкай служаць.

Чатыры гады ва ўніверсітэце праляцелі вельмі хутка. «Падчас навучання знаёміліся з усёй апаратурай, якая знаходзіцца ў войсках сувязі, таму ўнікаць у працэс непасрэдна на месцы службы не было складана», — кажа малады чалавек.

Міхаіл — начальнік аддзялення каналаўтварэння 86-й брыгады сувязі. Сярод задач, якія ўваходзяць у кампетэнцыю ваеннаслужачага, — забеспячэнне войскаў сувяззю, падтрыманне тэхнікі ў баявым стане, навучанне салдат тэрміновай службы.

«Асноўная задача ваенных сувязістаў — перадача інфармацыі, — звяртае ўвагу Міхаіл Копыл. — У параўнанні з нашымі папярэднікамі, якія ваявалі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, працаваць стала прасцей. Раней было вельмі шмат машын, за кожнай была замацавана канкрэтная задача. Цяпер адна машына замяняе пяць савецкіх. Пры гэтым растуць аб'ёмы інфармацыі, якая перадаецца з дапамогай відэасувязі, беспілотных лятальных апаратаў. Кіраваць усім гэтым нам дазваляе абсалютна новае лічбавае абсталяванне».

### МАТЧЫН ГОНАР

Са сваім будучым суджэнцам Дар'я пазнаёмілася ва ўніверсітэце: вучыліся ў адным узводзе. Дарэчы, менавіта ў той год, калі яна паступала, на ваенны факультэт БДУІР пачалі набіраць дзяўчат. Хто ведае, ці сустрэліся б калі-небудзь маладыя людзі, калі б не надумалі звязаць сваё жыццё з воінскай службай.

Дар'я родам з Чэрвеньскага раёна Мінскай вобласці. На яе жаданне служыць у арміі паўплываў стрыечны брат, які праходзіць службу ва ўнутраных войсках МУС. «Добрая работа, заробак, усё стабільна — гэта як мінімум, я таксама натхнілася і вырашыла паступаць», — расказвае дзяўчына. Сваё рашэнне Дар'я агучыла ў 11 класе. Родныя рашэнне дачкі падтрымалі.

«Было няпроста, — успамінае лейтэнант. — Трэба было прыязджаць у Ваенную акадэмію для здачы нарматываў, праходзіць шырокую медкамісію, псіхалагічныя тэсты. Паколькі я была непаўналетняя, са мной заўсёды была мама. Не ўсё атрымлівалася з першага разу, мама настойвала, каб я не здавалася. Думаю, што цяпер яна ганарыцца мной».

Калі Дар'я вызначылася з будучай прафесіяй, то старанна трэніравалася. Яна ведала, што адзін з крытэрыяў паступлення — добрая фізічная падрыхтоўка. З гэтым падчас навучання праблем акурат не было. Складаней было прызвычайвацца да новага ўкладу жыцця. «Калі дагэтуль жывеш з мамай, а потым трапляеш у асяроддзе з шэрагам абмежаванняў, гэта няпроста, — тлумачыць яна. — Цяпер я вельмі разумею салдат тэрміновай службы».

З апошнімі, дарэчы, Дар'і нярэдка даводзіцца кантактаваць падчас службы. Яна — начальнік апаратнай. У абавязкі ваеннаслужачай уваходзіць забеспячэнне закрытай тэлефоннай сувяззю, а таксама відэа-канферэнц-сувяззю вышэйшага афіцэрскага саставу.

### НА РОЎНЫХ

Будучыя муж і жонка пазнаёміліся падчас пачатковай ваеннай падрыхтоўкі. Міхаіл прызнаецца, што яго прывабілі смеласць Дар'і, вытрымка, з якой яна праходзіла кожнае выпрабаванне.

«Мы ўсе знаходзіліся ў роўных умовах, таму ніякіх насмешак і непаважлівых адносін да дзяўчат не было, — расказвае афіцэр. — Як кажуць, у арміі няма дзяўчат і жанчын — ёсць ваеннаслужачыя. Гэта сапраўды так. Яны з адказнасцю ставяцца да пастаўленых задач і выконваюць іх не горш за нас, мужчын».

Дар'я прызнаецца, што спачатку не звярнула ўвагі на Міхаіла. Затым, па яе словах, нешта шчоўкнула — і паміж імі ўзнікла штосьці большае, чым проста сяброўства. На трэцім курсе пажаніліся.

У першую чаргу, як з жартам заўважае Міхаіл, афіцыйны шлюб значна аблегчыў ім вучобу. Дапамагалі адно аднаму са складанымі заданнямі, пэўныя задачы нехта з пары вырашаў адразу за дваіх.

Кажуць, што і служыць у адной воінскай часці ім значна лягчэй. «Выручаем адно аднаго, — кажа Дар'я. — Зручна, што аднолькавы распарадак дня, што дабіраемся на службу па адным маршруце. Адначасова заступаем у нарад, у выніку разам адпачываем».

Асаблівым гонарам для маладой сям'і стаў удзел у парадзе з нагоды 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Міхаіл ехаў на тэхніцы, якая везла сцяг брыгады. Дар'я ў складзе жаночай каробкі ішла ў пешым разліку.

«Падрыхтоўка да парада патрабавала шмат сіл, але гэта таго было варта: ганарова, калі на цябе глядзіць уся краіна, — прызнаецца Дар'я Копыл. — На трыбунах знаходзілася мама, таму гонар за сваю краіну адчувала і яна. А я — яшчэ большую адказнасць».

Сям'я ваеннаслужачых цвёрда ўпэўнена ў тым, што калісьці правільна вырашылі быць абаронцамі Айчыны. «Сёння створаны ўсе ўмовы для службы, дзяржава падтрымлівае ваеннаслужачых, але, самае галоўнае, няма больш высакароднай справы, чым насіць афіцэрскія пагоны».

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

# МАРА СТАЛА ПРАФЕСІЯЙ



У Ваеннай акадэміі адбыўся выпуск лётчыкаў. Дыпломы аб заканчэнні ваеннай ВНУ і першыя афіцэрскія пагоны атрымалі 17 лейтэнантаў. Два выпускнікі скончылі Ваенную акадэмію з адзнакай.

Ва ўрачыстым мерапрыемстве з нагоды выпуску ўдзельнічалі камандуючы Ваенна-паветранымі сіламі і войскамі супрацьпаветранай абароны генерал-маёр Андрэй Лук'яновіч і начальнік Ваеннай акадэміі генерал-маёр Андрэй Гарбацэнка.

У завяршэнні ўрачыстасці маладых лётчыкаў павіншавалі іх родныя і блізкія.

**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

► стар. 11

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

30 кастрычніка 2024 г. № 41 (774)

Штотыднёвы дадатак газеты **ЗВЯЗДА**

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# ПРАБЛЕМЫ, ПЫТАННІ, ПРАПАНОВЫ...

## З чым ішлі жыхары Магілёўшчыны на прыём да сенатараў










**На мінулым тыдні ў рамках адзінага дня прыёму грамадзян члены Савета Рэспублікі на чале са Старшынёй Наталляй Качанавай працавалі ў Магілёўскай вобласці. Іх увагай былі ахоплены ўсе раёны Прыдняпроўскага краю, кожны ахвотны меў магчымасць агучыць свае праблемы. Сенатарам дапамагалі весці прыём прадстаўнікі органаў дзяржаўнай улады, рэспубліканскіх камітэтаў і ведамстваў. Гэта практыка дае магчымасць, з аднаго боку, больш уважліва прааналізаваць пытанне з пункту гледжання закона, з другога — зразумець, якія яшчэ ёсць прабелы ў заканадаўстве.**

**Для сенатараў гэта прынцыпова важна, бо Савет Рэспублікі, дзе яны працуюць, надзелены заканадаўчай ініцыятывай. Менавіта праз яго праходзяць усе тыя праекты законаў, па якіх мы жывём. Пытанні гучалі самыя што ні ёсць розныя і датычыліся ўсіх сфер чалавечага жыцця. Некаторыя заяўнікі ўжо неаднаразова звярталіся ў розныя інстанцыі, нават у суд...**

### Каб было справядліва

У Бабруйску выязны прыём правяла **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА.** Асноўная частка зваротаў была ад бабруйчан, але прысутнічалі і жыхары амаль усіх абласцей. Людзі скардзіліся на праблемы, якім па пяць і нават па дваццаць гадоў. Як, напрыклад, у жыхаркі Бабруйска, якая ў пачатку 2000-х пазычыла пад распіску шэсць тысяч долараў. Частку грошай даўжнік вярнуў, але далёка не ўсе. Жанчына спадзяецца, што яе зварот да сенатара дапаможа паскорыць працэс.

Пытанням сямейнага кшталту заўсёды аддаецца асаблівая ўвага. Грамадзяне прыходзілі з прыватнымі сямейнымі праблемамі, вельмі вострымі, складанымі, дзесьці заблытанымі. Як у жыхара з Гомельскай вобласці, маці якога трапіла ў турму. Малады чалавек сцвярджае, што закон вельмі сурова абышоўся з ёй. Гісторыя звязана з продажам іх кватэры, якая знаходзілася ў лізінгу.

Некалькі пытанняў датычыліся шматдзетных сем'яў. На прыём прыехала з Мінска маці траіх дзяцей. Яна ў разводзе з мужам і дамовіцца па-мірнаму наконт іх агульнай кватэры не атрымліваецца. Пры разводзе суд пакінуў за ёй і дзецьмі 56 % жылой плошчы, а за мужчынам 44 %. Былы муж збіраецца прадаваць сваю долю і ўсяляк уздзейнічае на жанчыну і дзяцей, пагражае ім. Кватэра пабудавана з улікам ільготнага крэдыту для шматдзетных, і заяўніца лічыць, што падзел зроблены несправядліва.

— 75 % пагашае дзяржава, мы аплачваем толькі 25 % на працягу 40 гадоў, — аргументавала яна. — А ён мне за 24 тысячы сваю частку кватэры прапаноўвае. А за што я яе выкуплю? Тым больш што кватэра трапіла нам «адмоўная». Мы ні капейкі не ўнеслі сваіх грошай. Цяпер толькі выплачваем крэдыт.

*(Заканчэнне на 8-й стар.)*

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



# Кадравы патэнцыял краіны

## Пры Нацыянальным сходзе сфарміраваны склад Маладзёжнага савета (парламента) трэцяга склікання

**Старшынёй Маладзёжнага савета абрана Аліна Рацькова. Першае пасяджэнне ў новым складзе прайшло з удзелам Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай. Спікер павіншавала тых, каго мясцовыя Саветы дэпутатаў вылучылі для работы ў Маладзёжным парламенце, і звярнула ўвагу, што гэта вельмі важная і адказная работа.**

Склад Маладзёжнага парламента трэцяга склікання абноўлены практычна поўнасцю, разам з тым пераемнасць захоўваецца.

«Традыцыі і вопыт тых, хто працаваў раней, павінны перадавацца, — лічыць Старшыня Савета Рэспублікі. — Гэта важна, бо за апошнія чатыры гады работы папярэдніх скліканняў на ўсіх мерапрыемствах, якія праводзяцца членамі Савета Рэспублікі, з намі заўсёды былі нашы калегі з Маладзёжнага савета. Гэта і пасяджэнні сесій, і сумесныя пасяджэнні абедзвюх палат Нацыянальнага сходу, і прыёмы па асабістых пытаннях. Я заўсёды рада бачыць юнакоў і дзяўчат на нашых мерапрыемствах».

Па словах Наталлі Качанавай, Маладзёжны парламент — гэта кадравы патэнцыял краіны. «Вы павінны разумець, што тыя, хто прыйшоў сюды і працуе дастаткова эфектыўна, атрымлівае неацэнны вопыт, — канстатавала яна. — Гэты вопыт абавязкова спатрэбіцца вам там, дзе вы працуеце цяпер, або на іншым месцы, бо ваша жыццё толькі пачынаецца. Вы толькі ў пачатку свайго працоўнага шляху, але разам з тым у кожнага з вас ужо ёсць грамадзянская пазіцыя».

Спікер падкрэсліла, што вялікую ўвагу моладзі ўдзяляе Прэзідэнт, разумеючы, што за ёю — будучыня. «Ад вас залежыць, якой будзе краіна ў перспектыве, — звяртаючыся да маладых парламентарыяў, адзначыла Наталля Качанава. — Ідзе змена пакаленняў, прыходзяць новыя маладыя людзі, якія далей будуць працягваць традыцыі суверэннай і незалежнай Беларусі. Вы павінны актыўна працаваць з імі, каб разумець, што хвалюе вашых аднагодкаў».

Старшыня Савета Рэспублікі звярнула ўвагу на тое, што юныя парламентарыі прыйшлі працаваць у цікавы перыяд: 26 студзеня 2025 года пройдуць выбары Прэзідэнта Беларусі, у маі будзе адзначацца 80-годдзе Вялікай Перамогі. «Беларусы ганарацца папярэднімі пакаленнямі, якія абаранілі нашу свабоду і незалежнасць, аднавілі краіну пасля разрухі і якія стваралі суверэнную Беларусь пасля развалу Савецкага Саюза, — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі. — Сёння мы жывем у цудоўнай і квітнеючай краіне, і гэта трэба шанаваць. Берагчы тое, што стваралася папярэднімі пакаленнямі да вас. Таму работа, якой вы будзеце займацца, дасць вам пэўныя навыкі, веды, дапаможа вам убачыць знутры, як працуе дзяржапарат».

Спікер заклікала парламентарыяў да актыўнай дзейнасці і заўважыла, што Беларусь з'яўляецца адным з сусветных лідараў па створаных для моладзі ўмовах, дзе маладзёжная палітыка — адзін з прыярытэтаў дзяржавы.

**Паводле БелТА.**

# ПРАБЛЕМЫ, ПЫТАННІ, ПРАПАНОВЫ...

*(Заканчэнне.
Пачатак на 7-й стар.)*

Наталля Качанава звярнула ўвагу, што апошнім часам у Мінску перыядычна паступаюць аналагічныя звароты і Савет Рэспублікі ўжо працуе над гэтай праблемай. «Калі распадаецца шматдзетная сям'я, вельмі важна абараніць інтарэсы дзяцей», — падкрэслівае яна.

Яшчэ адна шматдзетная сям'я з аграгарадка Барсукі Жодзінскага сельсавета папрасіла садзейнічанне ў вырашэнні зямельнага пытання. У сям'і выхоўваецца пяць дзяцей ва ўзросце ад 8 месяцаў да 17 гадоў. Жывуць у двухпакаёўцы ўсемярых, жадаюць пабудаваць дом. На іх думку, чарга для шматдзетных у іх аграгарадку ідзе вельмі павольна. Ім прапаноўваюць іншыя населеныя пункты, але яны хочуць будавацца менавіта ў Барсуках. На прыёме прысутнічаў начальнік Галоўнага ўпраўлення землеўпарадкавання Мінскага аблвыканкама Сяргей Шымук, які паведаміў, што зямельныя ўчасткі ў аграгарадку часткова фарміруюцца для выдзялення грамадзянам, а часткова прадаюцца з аўкцыёну. Ён таксама адзначыў, што ў ходзе аптымізацыі тэрыторыі школы плануецца сфарміраваць некалькі ўчасткаў, у тым ліку і для грамадзян. І ёсць шанц, што заяўнікам пашчасціць.

Наталля Іванаўна пацікавілася ў сужэнцаў, дзе яны працуюць, як ім жывецца ў Барсуках, ці хапае крам, якая адлегласць ад Жодзіна. Яны, у сваю чаргу, падзякавалі за падтрымку шматдзетных сем'яў, за тое, што дзяржава стаіць на абароне іх інтарэсаў.



Яшчэ адна мінчанка лічыць, што да пытання, якое датычыцца аліментаў, трэба кардынальна мяняць падыходы. Маўляў, калі чалавек, які плаціць аліменты, самазаняты, ездзіць, напрыклад, на заробкі за мяжу, павінен больш выдзяляць грошай на выхаванне свайго дзіцяці. «Але ў законе такія моманты не абазначаны, — пераражвае жанчына. — У мяне ж якраз такі выпадак. Былы муж выдзяляе нам дзвесце рублёў у месяц, а сам дарагія рэчы сабе купляе. Яму і справы няма да таго, што двухсот рублёў аліментаў недастаткова, каб дзіця выгадаваць». Наталля Качанава пагадзілася: праблема існуе, але ў ёй трэба дасканала разабрацца, каб не нашкодзіць іншым.

— Трэба прымаць правільная рашэнні, якія б былі станоўча ўспрыняты грамадствам, — падкрэсліла яна. — Таму мы і прапаноўваем людзям разам з намі падумаць, як правільна паступіць, якія нормы ўнесці ў заканадаўства, каб было зразумела, што чалавек павінен працаваць на сваю краіну, плаціць падаткі. З гэтых падаткаў складаецца ўсё: і зарплата бюджэтных арганізацый, і сацыяльныя пытанні. Перадусім, калі мы працуем над законапраектам, заўсёды асноўваемся на тых пытаннях, пра якія кажуць людзі. Але рашэнні трэба прымаць узважана і прадумана, таму што на адну катэгорыю людзей гэта будзе ўплываць так, а на другую — па-іншаму.

Жыхара Магілёва на прыём да сенатара прывяло супрацьстаянне са сваякамі ў правах на бацькоўскую спадчыну. Праблему яму растлумачыла намеснік старшыні «Дзяржкаммаёмасць», якая прысутнічала на прыёме. Але мужчына не пагадзіўся з яе пунктам гледжання. І спаслаўся на вынікі незалежнай экспертызы, якая зрабіла высновы, што яго правы парушаны. Наталля Качанава паабяцала, што справа будзе ўважліва разгледжана з улікам гэтай экспертызы. «Трэба, каб усё было справядліва», — адзначыла яна.

Наогул, ніводны чалавек не пайшоў з прыёму пакрыўджаным. Людзі разумелі, што нават калі праблема вырашыцца не на іх карысць, усё будзе паводле закона.

## Важныя сустрэчы

— Людзі ідуць да нас з рознымі праблемамі: ад сацыяльных і эканамічных да пытанняў, звязаных з мясцовымі ініцыятывамі, — паведаміў **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, галоўны інжынер — першы намеснік генеральнага дырэктара ААТ «Магілёўхімвалакно» Канстанцін СІРОЦІН**, які правёў прыём грамадзян у Крычаве. — Такія сустрэчы вельмі важныя для мяне і для нашай работы ў цэлым. Яны дазваляюць не толькі пачуць людзей, але і зразумець, з якімі праблемамі яны сутыкаюцца ў штодзённым жыцці. Кожны чалавек — гэта ўнікальная гісторыя, і я рады, што ў нас ёсць магчымасць абмеркаваць складаныя жыццёвыя моманты. Шмат хто мае ўжо гатовыя ідэі і прапановы па паляпшэнні сітуацыі. Выслухаць грамадзяніна — значыць зрабіць першы крок яму насустрач. Пераканаць, што сумеснымі намаганнямі можна знайсці рашэнні, якія сапраўды працуюць.

З Канстанцінам Сіроцiным салідарны і яго калега, член гэтай жа камісіі, **старшыня Магілёўскага аблсавета дэпутатаў Аляксандр ГАРОШКІН,** які прымаў грамадзян у Клімавіцкім райвыканкаме.

— Практыка актыўнай работы ў раёнах дазваляе трымаць руку на пульсе падзей і гнутка рэагаваць на запыты і патрэбы людзей.

Ён заўважыў, што больш за ўсё для грамадзян актуальныя праблемы жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

— Просьбы жыхароў не застаюцца без увагі, яны вывучаюцца, і па іх прымаюцца ўсе неабходныя меры, — удакладніў Аляксандр Рыгоравіч. — Сумесная работа органаў прадстаўнічай і выканаўчай улады дае станоўчы вынік у развіцці рэгіёнаў. А галоўная наша мэта — гэта рост дабрабыту беларусаў, захаванне міру і стабільнасці ў краіне.



Асабісты прыём грамадзян у Горках правёў **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Уладзіслаў ТАТАРЫНОВІЧ.**

Набалелыя пытанні датычыліся капрамонту шматкватэрнага дома, атрымання беларускага грамадзянства, стварэння на адным з аб'ектаў безбар'ернага асяроддзя, сацыяльнага жылля.

— Важна выслухаць чалавека, незалежна ад таго, з якой просьбай ён звярнуўся, — падкрэсліў Уладзіслаў Татарыновіч. — Практыка паказвае запатрабаванасць насельніцтвам выязных прыёмаў Савета Рэспублікі, і яны будуць праводзіцца рэгулярна ва ўсіх рэгіёнах краіны.

## Праблемы пераадольваюцца разам

Пытанні працаўладкавання, зямельных спрэчак, падтаплення ўчастка і іншыя прагучалі падчас прыёму грамадзян **старшынёй Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Леанідам ЗАЙЦАМ** у Бялыніцкім райвыканкаме.

Маладая жанчына звярнулася да яго з просьбай у дапамозе рэалізаваць добрую ідэю.

Яна індывідуальны прадпрымальнік, хоча ўзяць у арэнду вадаём, каб заняцца рыбалоўствам. Але ёсць складанасці. Пра іх яна і паведаміла сенатару. Ён пагадзіўся, што справа слушная.

— У Беларусі кожны кавалачак зямлі павінен быць дагледжаны, — падкрэсліў ён. — Калі ў маладой прадпрымальнай дзяўчыны ёсць жаданне заняцца рыбаводствам, няхай яго рэалізуе. Практыка сустрэч з людзьмі ў рэгіёнах заўсёды дае штуршок, каб адрэгуляваць праблему: бягучага характару або застарэлую, напрыклад, якая датычыцца добраўпарадкавання дарог, двароў. Мясцовыя ўлады не павінны адмахвацца ад такіх зваротаў. Усё, што ў інтарэсах нашай краіны, нашых людзей, павінна падтрымлівацца.

У жыхароў Магілёўскага раёна была магчымасць быць пачутымі **членам Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, першым сакратаром Цэнтральнага камітэта БРСМ Аляксандрам ЛУК'ЯНАВЫМ.** Прыём прайшоў на базе Палыкавіцкага сельсавета. Людзей непакоілі зямельныя спрэчкі з суседзямі, пытанні незаконнага звальнення з работы, пенсіённага заканадаўства, перспектывы развіцця вёскі, пераносу прыпынку аўталаўкі. Заяўнікі былі ўважліва выслуханы, іх пытанні ўзяты на кантроль. Аляксандр Лук'янаў скарыстаўся магчымасцю пасля прыёму грамадзян яшчэ і сустрэцца з працоўным калектывам ААТ «Палыкавічы». Ён пацікавіўся іх праблемамі, а таксама закрануў тэму патрыятычнага і працоўнага выхавання моладзі, будучай электаральнай кампаніі.

— Усе мы зацікаўлены ў захаванні цэласнасці нашай краіны і гістарычнай праўды, — падкрэсліў ён. — Таму павінны быць кансалідаваныя.

Толькі ў адзінстве можна ўсё пераадолець. Такі пасыл прагучаў і ад **члена Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржбудаўніцтве, генеральнага дырэктара ААТ «Беларускі цэментны завод» Ігара СЯРГЕЕВА.** У рамках правядзення адзінага дня прыёму грамадзян ён працаваў у Касцюковіцкім райвыканкаме. Падсумоўваючы вынікі, сенатар рэзюмаваў: «Калі грамадзяне ідуць на прыём, значыць, давяраюць уладам. І гэта вельмі важна, каб захаваць адзінства».

Усе пытанні, якія паступілі сенатарам падчас адзінага дня прыёму грамадзян, узяты на ўлік Саветам Рэспублікі і будуць дасканала разгледжаны ў абазначаныя заканадаўствам тэрміны. Заяўнікі атрымаюць поўны і аргументаваны адказ на свае звароты.

— Пытанні тыповыя. Магчыма, яны не глабальнага маштабу, але вельмі важныя для людзей, — паведаміла **вядучы рэферэнт аддзела па рабоце са зваротамі грамадзян сакратарыята Савета Рэспублікі Крысціна ПОБЫЛЬ.** — У ходзе кожнага прыёму Савет Рэспублікі імкнецца дапамагчы ўсім. Адны з найбольш распаўсюджаных — пытанні па зямельных і маёмасных зносінах, а таксама тыя, якія закранаюць жыццёвыя інтарэсы сям'і, асобнага чалавека. Знайсці рашэнне ў рамках заканадаўства бывае няпроста. Спрабуем гэта рабіць з удзелам прадстаўнікоў органаў дзяржулады, рэспубліканскіх органаў кіравання. Людзі, якія пабывалі на прыёме, павінны атрымаць надзею, садзейнічанне ў вырашэнні праблем. Ім трэба растлумачыць сітуацыю, дапамагчы знайсці выйсце са складанай сітуацыі. Мы дапамагаем, і нам удзячныя, выказваюць словы падзякі. Некаторыя пытанні паспяваюць вырашыцца яшчэ да пачатку прыёму. Гэта сведчыць аб эфектыўнасці нашых выязных прыёмаў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота БелТА
і прэс-службы Савета Рэспублікі.**

# ПА ДЭПУТАЦКІМ ЗАПЫЦЕ

## Старшыня Брэсцкага гарадскога Савета Андрэй Філановіч — аб дэпутацкіх ініцыятывах, гарадскіх праектах, працоўных акцыях і не толькі

**Улютым на Адзіным дні галасавання былі выбраны 40 дэпутатаў Брэсцкага гарадскога Савета 29-га склікання. Саветам утворана пяць пастаянных камісій, у якіх працуюць дэпутаты. Многія народныя выбраннікі з першых дзён вызначыліся актыўнасцю ў сваіх акругах, іншыя плённа працуюць у камісіях. Прайшло крыху больш за паўгода работы ў новым скліканні. Пра некаторыя вынікі першага паўгоддзя, добрыя справы дэпутатаў, праблемы, якія вырашаюцца, сённяшняя наша гутарка са старшынёй Брэсцкага гарадскога Савета Андрэем ФІЛАНОВІЧАМ.**

***— На нядаўнім выязным семінары Палаты прадстаўнікоў па пытаннях рэалізацыі грамадзянскіх ініцыятыў, які праходзіў у Брэсцкай вобласці, згадвалі ў якасці прыкладу надзвычай цікавую грамадзянскую ініцыятыву жыхароў Брэста пад назвай «Здаровы горад». Прапаную пачаць гаворку з распаведу аб тым, як ідзе работа па ажыццяўленні праекта.***

— Гэта адна з пяці ініцыятыў, якія выйгралі ў абласным конкурсе, арганізаваным абласной асацыяцыяй мясцовых Саветаў дэпутатаў. Спачатку нарадзілася ідэя ўстанавіць у скверы па вуліцы Маскоўскай вулічныя трэнажоры для трэніровак, для падтрымання фізічнай формы людзей усіх узростаў. Ініцыятарам, ідэйным натхняльнікам, а пазней адным з арганізатараў выступіла дэпутат гарадскога Савета Наталля Арцымені. Пачалі з пошукаў нераўнадушных, зацікаўленых людзей з ліку жыльцоў навакольных дамоў. Апошнія выказалі гатоўнасць фінансава ўдзельнічаць у добрай справе. Па ўмовах конкурсу пэўную частку фінансавання павінны ўзяць на сябе грамадзяне, яшчэ частку — спонсары, астатняе — большая частка грошай — выдзяляецца з бюджэту. Так і сталася ў нашым выпадку. Рашэннем гарвыканкама выканаўцам работ было вызначана прадпрыемства КУП «ЖРЭУ г. Брэста». Усе сродкі сабраны на адным рахунку, днямі падпісаны дагавор на ажыццяўленне работ. Праўда, у сувязі з правядзеннем тэндараў справа закупак крыху зацягнулася, але ж разлічваем, што ў пачатку лістапада будуць праведзены неабходныя закупкі, і арганізацыя пачне падрыхтоўку пляцоўкі пад мантаж абсталявання. Апошняе пастаўшчык абяцае правесці ў сціслыя тэрміны.

Гэта быў першы вопыт падобнай работы. Лічу яго вельмі паказальным для ўсіх. Мы будзем яго абагульняць, расказваць насельніцтву аб тым, што пры мінімальным удзеле кожнага талакой можна зрабіць патрэбную, карысную справу для ўсіх. А ў тым, што вулічныя трэнажоры патрэбныя гараджанам, ніхто не сумняваецца. Там будуць прыстасаванні, якія запатрабаваны, напрыклад, у асяроддзі пенсіянераў. На гэтым ад пачатку рабіўся асаблівы акцэнт. Людзям сярэбранага ўзросту, якія маюць шмат вольнага часу, важна займацца фізічнымі практыкаваннямі на карысць здароўя. А яшчэ гэта будзе пляцоўка для іх камунікацый, для знаёмства, для сумеснага карыснага правядзення часу.

***— Такім чынам вырашаецца не толькі задача стымулявання фізічнай актыўнасці гараджан, але і іх усебаковага аздараўлення. Вы лічыце, што пляцоўка здольная паспрыяць дружбе, адзінству суседзяў па вуліцы і двары?***

— Вядома. Пералічанага вамі так не хапае. Ці вам казаць, што цяпер у вялікіх гарадах мы жывём і не ведаем суседзяў па пад'ездзе, а то і па лесвічнай пляцоўцы. А на сумесных занятках фізкультурай людзі паглядзяць адно на аднаго, усміхнуцца, а нехта і пазнаёміцца. Гэта важна, а яшчэ там сустрэнуцца грамадзяне розных пакаленняў. Да трэнажораў прыйдуць студэнты, маладыя бацькі з дзеткамі. І галоўнае, на што мы разлічвалі, калі пачыналі праект, — людзі, якія ўдзельнічалі ў фінансаванні, будуць беражліва ставіцца да абсталявання, сачыць за парадкам і папярэджваць выпадкі вандалізму, якія, на жаль, здараюцца ў нашых гарадах.

Нядаўна я гаварыў аб гэтым на сустрэчы са старшынямі жыллёвых кааператываў, расказваў пра спосаб паляпшэння дваровых тэрыторый на прынцыпах сумеснага фінансавання грамадзян і бюджэту. Магчымасці шырокія, трэба толькі не ленавацца, шукаць ініцыятыўных людзей, як след афармляць праект і паэтапна рухацца па шляху яго ажыццяўлення. І яны, старшыні ЖБК, зацікавіліся. Як паказвае вопыт, важна пачаць, а потым і сам парадуешся вынікам работы па добраўпарадкаванні, паляпшэнні, упрыгажэнні тэрыторый. Часам, дарэчы, і без збору грошай можна многае зрабіць, калі толькі аб'яднаць намаганні многіх людзей.

***— Маеце на ўвазе працоўныя акцыі накшталт такой, якая праводзіцца цяпер у лясным масіве паблізу абласной бальніцы?***

— Так, гэта вельмі важная і вельмі значная справа, якую за адзін суботнік, нават за месяц альбо два не адужаеш. Але ў нас ёсць вопыт. У цяперашнім складзе гарадскога Савета ёсць дэпутаты, якія працавалі і ў папярэднім скліканні. Яны актыўна ўдзельнічалі ў працоўных акцыях па добраўпарадкаванні, паляпшэнні, я б нават сказаў, аднаўленні парку Воінаў-інтэрнацыяналістаў. Гэта асаблівае месца для брастаўчан, якія жывуць ва ўсходняй частцы горада. У названым парку гуляюць матулі з калясачкамі ўжо некалькі дзесяцігоддзяў. Але паступова парк стаў зарастаць дрэвамі, кустоўем, у асобных месцах ён пачаў нагадваць дзікі лясны масіў. Такія глухія мясціны абломбавалі асобы не самых узорных паводзін, дзе ладзілі свае «тусоўкі» з выпіўкай. Такім чынам, парк станавіўся не самым прывабным і бяспечным месцам. Некалькі гадоў таму паляпшэнне парку стала справай усяго Маскоўскага раёна, дэпутацкага корпуса, далучыліся многія прадпрыемствы і арганізацыі. Цяпер нават цяжка назваць колькасць суботнікаў, працоўных акцый, праведзеных там. На ўсё пайшоў ладны адрэзак часу, але мы паступова прасеклі, прачысцілі парк, ён стаў прагляднага, зрабіўся светлым, я б сказаў, прывітлівым. За кошт бюджэту там правялі дадатковае добраўпарадкаванне, дабавілі лавак, ліхтароў. І мясціна стала сапраўдным сямейным паркам. Зайдзіце ў любы выхадны дзень, паглядзіце, колькі там сем'яў з дзецьмі гуляе! Малыя кормяць вавёрак, якіх там жыве вельмі многа. Сем'і гуляюць і дыхаюць свежым паветрам. У будныя дні можна сустрэць кампаніі шаноўных пенсіянераў, якія сустракаюцца і абмяркоўваюць свае справы. Нядаўна я зазірнуў у кафэ на цэнтральнай алеі, пацікавіўся, што найлепш прадаецца. Дык яны сказалі, што прадаюць больш за ўсё чаю, кавы, салодкіх вырабаў, хоць у асартыменце ёсць і слабаалкагольныя напоі. Пачутае надзвычай парадавала і стала яшчэ адным сведчаннем, што парк Воінаў-інтэрнацыяналістаў стаў месцам сямейнага адпачынку.



Андрэй ФІЛАНОВІЧ.

Дык вось па гэтым прынцыпе мы падышлі да работы з лесапаркавым масівам у раёне вуліцы Медыцынскай. Гэты масіў, вобразна кажучы, служыць лёгкімі вялікага медыцынскага гарадка, у склад якога ўваходзіць не толькі абласная клінічная бальніца, але яшчэ і некалькі стацыянарных бальнічных устаноў. У цёплую пару года там гуляюць людзі, якія праходзяць курс лячэння, а свежае паветра, як вядома, спрыяе хутчэйшаму выздараўленню. Ідзём ужо выверанаым шляхам. Праводзім працоўныя акцыі, суботнікі, прарэджваем, прачышчаем лясны масіў, каб ён стаў больш прывабным для прагулак. Варта адзначыць, што ў такіх працоўных акцыях актыўнасць праяўляюць маладыя людзі.

***— Знаю, што вы ўдзяляеце вялікую ўвагу рабоце з Маладзёжным парламентам. Раскажыце, калі ласка, аб гэтым больш падрабязна.***

— Так, у нас ужо сфарміраваны гарадскі маладзёжны парламент, у склад якога ўвайшлі 40 чалавек. Іх, дарэчы, выбіралі больш чым з сотні кандыдатаў. У адрозненне ад некаторых Саветаў, мы не павышалі ўзроставую планку, пакінулі ранейшую — 15 гадоў. Такім чынам, у нашым маладзёжным парламенце ёсць тры школьнікі, некалькі студэнтаў. Але ж асноўны акцэнт зроблены на маладых людзей, якія працуюць. Найперш для таго, каб яны прадстаўлялі інтарэсы маладых працаўнікоў, а мы мелі зваротную сувязь, ведалі, што хвалюе моладзь, што яе цікавіць, чым яна жыве. Важна таксама, каб прадстаўнікі маладога пакалення бралі актыўны ўдзел у грамадскім жыцці горада і краіны. Нездарма ж у апошняй рэдакцыі Канстытуцыі была ўнесена норма аб тым, што дзяржава садзейнічае ўсебаковаму развіццю асобы, стварае неабходныя ўмовы для яе свабоднага і эфектыўнага ўдзелу ў грамадскім жыцці, рэалізацыі патэнцыялу моладзі ў інтарэсах усяго грамадства.

Зусім нядаўна, у кастрычніку, мы правялі першае пасяджэнне Маладзёжнага парламента, на якім былі выбраны старшыня, яго намеснікі, склад камісій. А яшчэ рашэннем гарадскога Савета за кожным з членаў маладзёжнага парламента мы замацавалі дэпутата ў якасці настаўніка.Такім чынам, малады чалавек разам са старэйшым таварышам можа ўдзельнічаць у прыёмах грамадзян, у патрыятычных акцыях, гарадскіх мерапрыемствах і атрымліваць пэўны вопыт.

> Цяпер у вялікіх гарадах мы жывём і не ведаем суседзяў па пад'ездзе, а то і па лесвічнай пляцоўцы. А на сумесных занятках фізкультурай людзі паглядзяць адно на аднаго, усміхнуцца, а нехта і пазнаёміцца. Гэта важна, а яшчэ там сустрэнуцца грамадзяне розных пакаленняў. Да трэнажораў прыйдуць студэнты, маладыя бацькі з дзеткамі. І галоўнае, на што мы разлічвалі, калі пачыналі праект, — людзі, якія ўдзельнічалі ў фінансаванні, будуць беражліва ставіцца да абсталявання, сачыць за парадкам і папярэджваць выпадкі вандалізму, якія, на жаль, здараюцца ў нашых гарадах.

І яшчэ. Нават з першых стасункаў з нашай маладой зменай я заўважыў у іх сапраўдны інтарэс да жыцця горада, яны маюць свой погляд на вырашэнне некаторых задач у плане гарадскога жыцця і, галоўнае, выглядаюць зацікаўленымі, нераўнадушнымі, што, вядома ж, усяляе аптымізм. А мы падзелімся з імі вопытам работы: ад падрыхтоўкі пытання на сесію да правільнага афармлення дэпутацкіх запытаў.

***— Дарэчы, як ідзе работа над выкананнем наказаў выбаршчыкаў?***

— Усе наказы, якія прагучалі падчас сустрэч нашых дэпутатаў, калі яны яшчэ былі кандыдатамі і сустракаліся з выбаршчыкамі, абагулены і зведзены ў адзін дакумент. Гарадскі Савет трымае гэтыя мерапрыемствы на кантролі. Напрыклад, у раёне новабудоўляў па вуліцы Луцкай падсыпана дарожка ў бок вуліцы Валгаградскай для праходу людзей. Такі наказ атрымала Святлана Шукайла, калі балатавалася ў гарсавет. Вядома, калі будоўля там скончыцца, дарожкі будуць добраўпарадкаваны, але ж людзі там ходзяць і цяпер, калі выбіраюцца на работу, у школу, у магазін. А прайсці, асабліва пасля дажджу, мокрага снегу, станovіцца праблемай. Таму пасля належным чынам афармленага дэпутацкага запыту адна з арганізацый атрымала даручэнне, у выніку была праведзена падсыпка дарожкі. Цяпер хадзіць там стала нашмат больш камфортна.

Падчас сустрэч з кандыдатам у дэпутаты Дзмітрыем Прошыным жыхары мікрараёна Дуброўка выказвалі прапановы па паляпшэнні мясцовасці ў раёне СШ № 33. І вось філіял «Бярэсце-шклоопт» ТАА «Шклоопт», якое ўзначальвае Дзмітрый Прошын, зрабіла сапраўдны падарунак жыхарам названага раёна. Стыльныя дэкаратыўныя лаўкі ў выглядзе літар упрыгожылі былую пустку. Дзякуючы зялёным насаджэнням, арыгінальнай падсветцы ўся кампазіцыя склалася ва ўтульны куток адпачынку.

Пералік можна працягваць. Скажу толькі, што да запытаў дэпутатаў гарадскога Савета ўсе ўстановы і арганізацыі горада ставяцца адказна. Апошняе ўжо ў нашай традыцыі.

***— А яшчэ якія добрыя традыцыі мае гарадскі орган прадстаўнічай улады?***

— Я б вылучыў традыцыю пераемнасці ў гарсавеце. Дэпутаты мінулых скліканняў не страчваюць сувязь з гарадскім Саветам, цікавяцца жыццём горада. Я, напрыклад, не саромеюся спытаць парады ў свайго папярэдніка Мікалая Васільевіча Красоўскага, а ён з задавальненнем дзеліцца багатым вопытам. І яшчэ адна з нашых традыцый — працаваць у цеснай звязцы з дэпутатамі ўсіх узроўняў. Літаральна нядаўна разам са старшынёй гарвыканкама Сяргеем Лабадзінскім мы правялі сустрэчу з нашымі парламентарыямі: Валянцінай Пух, Вольгай Сцёпусь, Уладзімірам Баравенкам, Андрэем Крупенькіным. Сустрэча атрымалася даволі канструктыўнай. Акцэнт быў зроблены на пытаннях праваприм'яняльнай практыкі і на магчымасці сумесных намаганняў па ўнясенні змяненняў у асобныя законы. Дамовіліся, што ў кожны прыезд парламентарыяў для работы ў акругах будзем актыўна камунікаваць, абменьвацца інфармацыяй, выпрацоўваць планы сумеснай работы. Варта сказаць, што нашы парламентарыі — сапраўдныя патрыёты любімага горада. Скажам, на агульнагарадскім суботніку 19 кастрычніка ўсе яны працавалі разам са сваімі выбаршчыкамі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

**Фота Брэсцкага гарадскога Савета.**

НАШЫ ЛЮДЗІ

# Сакрэт яе маладосці

**У вёсцы Зарэчная Слабада Чашніцкага раёна праблемы мясцовых жыхароў дапамагае вырашаць старэйшына Марыя РАБЦАВА. Нягледзячы на паважны ўзрост (а ёй ужо 81 год) жанчына не перастае клапаціцца аб узроўні жыцця вяскоўцаў.**

Калі ўзнікаюць пытанні, старэйшына наўпрост тэлефануе старшыні Празямлянскага сельвыканкама Мікалаю Яроху. Ён заўсёды на сувязі і ніколі не адмовіць. Кажа, што Марыя Рабцава — самая актыўная са старэйшын. Уся грамадская тэрыторыя Зарэчнай Слабады, дзе налічваецца 61 двор, выкашана дзякуючы Марыі Іванаўне. Калі людзі не прыводзяць у парадак участкі каля сваіх дамоў, неабыякавая аднавяскоўка зверне на гэта ўвагу і знойдзе метады для матывацыі.

Калі старшыня Празямлянскага сельвыканкама прапанаваў ёй узяць на сябе пэўную долю адказнасці за тое, што адбываецца ў вёсцы, Марыя Іванаўна думала нядоўга. Кажа, пайшла насустрач кіраўніку органа мясцовага кіравання таму, што выдатна разумела: адзін старшыня нічога не зробіць, яму патрэбна падтрымка ў асобе дэпутацкага корпуса, старэйшын. Ну, а актыўнай пазіцыяй вызначалася яшчэ ў маладосці, ніколі не была абыякавай да таго, чым жывуць раён, родная гаспадарка, вёска.

Бывала, зімой, не чакаючы работнікаў ЖКГ, Марыя Рабцава брала ў рукі рыдлёўку і сама чысціла снег на мосце, што злучае Чашнікі і вёску, пасыпала соллю. Даводзілася самой прыбіраць каля смеццевых кантэйнераў. Між тым, па назіранні старэйшыны, смецяць там не толькі вяскоўцы, але і жыхары з найбліжэйшых дамоў райцэнтра.

«Работа вулічнага асвятлення, утрыманне дарожнай сеткі, забеспячэнне жыхароў вёскі добрай пітной вадой — тыя пытанні, з якімі людзі ідуць да дэпутата. Я ў Зарэчнай Слабадзе жыву з 1974 года, усіх вяскоўцаў добра ведаю, магу расказаць, хто чым жыве. І іх праблемы для мяне не чужыя», — дзеліцца старэйшына.



Вяскоўцы раёна карыстаюцца вадой з нецэнтралізаваных крыніц водазабеспячэння, у тым ліку з шахтавых калодзежаў. Калодзеж — не толькі галоўны атрыбут вясковага жыцця, у многіх вёсках ён застаецца адзінай крыніцай вады. Але іх стан часам далёкі ад ідэалу. Вось і калодзеж па вуліцы Цэнтральнай у вёсцы Зарэчная Слабада некалькі гадоў таму быў у іх ліку, аднак сітуацыя змянілася ў найлепшы бок.

Па словах Марыі Іванаўны, гэта адзіны калодзеж, у якім бяруць ваду для піцця практычна ўсе жыхары Зарэчнай Слабады. Ёсць у населеным пункце цэнтральнае водазабеспячэнне, толькі якасць вады вымушае жадаць лепшага. Як сцвярджаюць мясцовыя, не дапамагаюць нават фільтры. Вось і ратуе стары калодзеж. З часам ён струхлеў і пачаў разбурацца. Надбудова была ў дзірках, праз якія траплялі пыл, дажджавая вада. Патрабаваўся рамонт. Жыхары пачалі звяртацца па ўсіх інстанцыях у сельсавет, жыллёва-камунальную гаспадарку. Збіраліся нават арганізоўваць падваровы абход, каб адшукаць сродкі на рамонт.

Падтрымаў аднавяскоўцаў Юрый Каралёў, ураджэнец Зарэчнай Слабады. З ранніх гадоў ён памятае стары грамадскі калодзеж. Цяпер мужчына жыве ў Мінску, працуе ў будаўнічай фірме, якая займаецца ўстаноўкай шклопакетаў, цэглы і альтанак. Не змог ён глядзець, як калодзеж руйнуецца, і вырашыў зрабіць падарунак для землякоў: аднавіць яго. Прывёз неабходны інструмент і будаўнічыя матэрыялы.

Марыя Іванаўна расказала, што папрацаваў Юрый са сваімі братамі добрасумленна, усё зрабілі акуратна і прыгожа. Новая надбудова надзейна ўмацавана, шчылін у ёй няма. Афарбавалі канструкцыю, замянілі ланцуг, вядро. Цяпер калодзеж выглядае эстэтычна, і карыстацца ім стала значна зручней. Вяскоўцы не стамляюцца радавацца і дзякаваць свайму земляку за добрую справу.

Быў у практыцы старэйшыны і вопыт камунікацыі з праблемнымі бацькамі. Сама жанчына выгадавала пяцярых дзяцей, ведае, што яны — самая вялікая каштоўнасць. Таму заўсёды выхоўвала, пераконвала тых, хто мог прамяняць малых на вясёлую кампанію; дапамагала дзецям.

Дарэчы, у дапамозе Марыя Іванаўна не адмаўляе нікому. Не можа 86-гадовая суседка схадзіць у краму — прадукты ёй даставіць старэйшына. І такіх момантаў набіраецца нямала, менавіта з іх і складваецца паспяховая праца народнага выбранніка з насельніцтвам.

Цяжкасцяў у сваёй рабоце старэйшына не адчувае. «Я ж амаль сорак гадоў адпрацавала даяркай, 18 галоў за гадзіну дваццаць хвілін даіла. Ці мне баяцца складанасцяў? Ды і аднавяскоўцам заўсёды можна растлумачыць, што той жа парадак каля дома навесці — гэта ж ім толькі на карысць», — дзеліцца жанчына.

У свaім паважным узросце Марыя Іванаўна спраўляецца на агародзе, садзіць кветкі, а ў халодную пару года вяжа дыванкі. А яшчэ — умела карыстаецца інтэрнэтам і мабільным тэлефонам.

«Вядома, давер трэба апраўдваць. Старэйшына на вёсцы — самы блізкі да народа чалавек. Якія ў мяне прывілеі? Галоўнае — магчымасць рабіць жыццё аднавяскоўцаў лепшым і больш камфортным», — гаворыць Марыя Іванаўна.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**
**Фота «Чырвоны прамень».**

КАРЫСНЫ ДОСВЕД

# СТАРТЫ, ЯКІЯ АБ'ЯДНОЎВАЮЦЬ

## Ваенна-патрыятычныя клубы абмяняліся вопытам

**У Касцюковічах адбыліся міжраённыя спаборніцтвы ваенна-патрыятычных клубаў гэтага райцэнтра, а таксама Быхава, Слаўгарада і Краснаполля. Удзел у іх узялі каля 100 юнакоў і дзяўчат. Моладзь прадэманстравала свае магчымасці ў конкурсе па страявой падрыхтоўцы, па аказанні першай медыцынскай дапамогі, у разборцы-зборцы аўтамата, камбінаванай эстафеце, на веданне гісторыі.**

Спаборніцтвы адбыліся на базе Касцюковіцкага фізкультурна-аздараўленчага цэнтра і праходзілі вельмі дынамічна і відовішчна пры поўных трыбунах. У рамках мерапрыемства былі арганізаваны выставы аб дзейнасці касцюковіцкага ваенна-патрыятычнага клуба «Зубр», зброі і баявой тэхніцы, а таксама паказальныя выступленні АМАПу і кінолагаў. Маштабнае мерапрыемства было прысвечана 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

— Касцюковіцкі раён стаў першым у краіне, дзе пры аддзеле адукацыі з'явіўся ваенна-патрыятычны клуб, — паведаміла **дэпутат Палаты прадстаўнікоў Аляксандра МІХЕЕНКА.** — У нас назапасіўся пэўны досвед, якім мы захацелі падзяліцца з іншымі, бо ў кожным раёне ёсць свая разынка ў тэме ваенна-патрыятычнага выхавання.

Найлепшы вынік паказала каманда «Міратворац» з Быхава, на другім месцы касцюковіцкі «Зубр», на трэцім — каманда з Краснаполля. Дыплом «За волю да перамогі» атрымала каманда «Нашчадкі» СШ № 1 са Слаўгарада.

Узнагароды ўдзельнікам уручылі ганаровыя госці ад беларускага парламента — Аляксандра Міхеенка і член Савета Рэспублікі Ігар Сяргееў.

— Падобныя старты аб'ядноўваюць, — адзначыла Аляксандра Міхеенка. — У нашым рэгіёне яны сталі стартавым пунктам. Юнакі і дзяўчаты — малайцы, яны падышлі да справы з вялікай адказнасцю. Усё было арганізавана на найвышэйшым узроўні. Будзем чакаць новых сустрэч.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**



МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 03.04.2004. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 11.724. Нумар падпісаны ў 19.30 29 кастрычніка 2024 года.

Спецыяльны рэпартаж

# НЕ ПРОСТА ЮНАКІ, А САПРАЎДНЫЯ АБАРОНЦЫ АЙЧЫНЫ

## У Беларусі працягваецца адпраўка прызыўнікоў у армію

**Вось ужо тыдзень у нашай краіне праходзяць мерапрыемствы па адпраўцы прызыўнікоў для праходжання тэрміновай ваеннай службы. У першы дзень адпраўкі, 22 кастрычніка, каля цэнтральнага ўвахода ў парк Перамогі адбыўся ўрачысты мітынг, прысвечаны першаму дню адпраўкі ў армію грамадзян горада Мінска, прызваных на тэрміновую ваенную службу, службу ў рэзерве. У першы дзень з усіх абласных і Мінскага гарадскога зборных пунктаў у войскі было адпраўлена каля тысячы прызыўнікоў. Яны папоўнілі шэрагі сіл спецыяльных аперацый, Мінскай ваеннай камендатуры, 72-га аб'яднанага навучальнага цэнтра падрыхтоўкі прапаршчыкаў і малодшых спецыялістаў.**



У парку Перамогі для новага папаўнення былі арганізаваны паказальныя выступленні. Ваеннаслужачыя сіл спецыяльных аперацый Узброеных Сіл падрыхтавалі для прызыўнікоў яркае шоу, якое, несумненна, не пакінула нікога абыякавым. Карэспандэнты «Звязды» далучыліся да ўрачыстага мерапрыемства і высветлілі, з якім настроем будучыя абаронцы Радзімы пакідаюць родныя мясціны. Павіншаваць навабранцаў прыйшлі ветэраны Узброеных Сіл, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый, вучні школ, гімназій і ваенна-патрыятычных класаў, бацькі, сваякі і сябры будучых салдат.

### СВЯТЫ АБАВЯЗАК

Як распавёў **намеснік начальніка галоўнага арганізацыйна-мабілізацыйнага ўпраўлення Генеральнага штаба Узброеных Сіл палкоўнік Юрый КУЗЬМІН**, у ваенных камісарыятах завяршаецца планавая работа па ўсебаковым вывучэнні і прафадборы прызыўнікоў. «Усяго на ўкамплектаванне войскаў плануецца накіраваць каля 10 тысяч грамадзян, — адзначыў ён. — Адпраўка новага папаўнення праводзіцца ў знакавых для беларусаў месцах з прыцягненнем мясцовых органаў улады, грамадскасці, духавенства і бацькоў. Цырымонія прыняцця Ваеннай прысягі новапрыбыўшым папаўненнем у злучэннях і воінскіх часцях Узброеных Сіл адбудзецца 23 лістапада. Звальненне ваеннаслужачых пройдзе планава, у адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам».

Па яго словах, грамадзяне да праходжання тэрміновай службы гатовыя. Яны заматываваны і ідуць на службу з жаданнем, як сапраўдныя патрыёты сваёй краіны.

Як звярнуў увагу **ваенны камісар горада Мінска палкоўнік Аляксей КАЛЫВАНАЎ**, ва ўсе часы ў нашай краіне абаронцы Айчыны карысталіся асаблівай павагай. «У гісторыі беларускай дзяржавы шмат прыкладаў воінскай славы, доблесці, мужнасці і адвагі нашых салдат і афіцэраў, — падкрэсліў ён, звяртаючыся да навабранцаў. — Вам, будучым салдатам, ёсць чым ганарыцца і з каго браць прыклад. Подзвіг народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны ніколі не згасне. Нашы Узброеныя Сілы служаць гарантам бяспекі і стабільнага развіцця нашай краіны».

Ваенны камісар Мінска дадаў, што сёння калектыўны Захад выкарыстоўвае ўсе магчымасці, каб унесці разлад у наша грамадства, пагражае ў тым ліку і нашай бяспецы. «Наша задача — гэтага не дапусціць, — сарыентаваў Аляксей Калыванаў. — Дарагія бацькі, упэўнены, што вы сустрэнеце пасля арміі ўзмужнелых, больш самастойных і мэтанакіраваных сыноў. Упэўнены, што нашы дзеці, якія стаяць у страі, стануць годнымі абаронцамі Айчыны і з поспехам асвояць воінскія спецыяльнасці».

**Старшыня Мінскай гарадской арганізацыі грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз афіцэраў» генерал-маёр у адстаўцы Анатоль ФАМІН**, звяртаючыся да прызыўнікоў, пажадаў, каб ніколі на нашай беларускай зямлі не было вайны. «Вы ўсе ведаеце, што абстаноўка ў свеце цяпер складаная, — канстатаваў ён. — Неабходнасць умацоўваць



баяздольнасць Узброеных Сіл і сілавых структур наспявае з кожным днём усё больш і больш. Вы сёння становіцеся ў гэты строй, і мы, ветэраны, і вашы бацькі, спадзяёмся, што вы нас не падвядзеце і будзеце добрымі абаронцамі нашай Айчыны».

Анатоль Фамін падзякаваў бацькам прызыўнікоў за тое, што яны выхавалі такіх мужных і патрэбных хлопцаў, якія з сённяшняга дня становяцца ў строй Узброеных Сіл і сілавых структур. Вопыт, атрыманы ў войсках, па яго словах, маладым людзям абавязкова спатрэбіцца.

### З ДОБРЫМІ ПАЖАДАННЯМІ

